НАВУКА КІРАВАЦЬ ЭМОЦЫЯМІ

Сямейная субота

ТАНЦЫ ШЛЮБНАГА ТЭСТУ

Сямейная субота

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

16 МАЯ 2019 г. ЧАЦВЕР № 89 (28956)

ЛЯСНАЯ ТАЛАКА

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Работнікі Бараўлянскага спецлясгаса Мінскага раёна высаджваюць дрэўцы елкі еўрапейскай абапал аўтадарогі М3 на ўчастку ад Мінска да развязкі на пасёлак Бараўляны.

ЛІЧБА ДНЯ

3 мільярды

долараў *інвестыцый уклалі ў рэальны сектар эканомікі Беларусі (акрамя банкаў) замежныя інвестары за студзень — сакавік 2019 года, паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце. Асноўнымі інвестарамі арганізацый краіны былі суб'екты гаспадарання Расіі (40,9 % ад усіх інвестыцый), Вялікабрытаніі (20 %), Кіпра (10,8 %). Паступленне прамых замежных інвестыцый склала $2,5 млрд, або 83,8 % ад усіх замежных інвестыцый. Арганізацыі Беларусі (акрамя банкаў) за студзень — сакавік 2019 года накіравалі за мяжу інвестыцый на суму $1,4 млрд.*

КАРАТКА

Рэальныя грашовыя даходы беларусаў у I квартале выраслі на 7,3 %.

КДК у сакавіку — красавіку выявіў на сельгасаб'ектах больш за 1,8 тысячы фактаў безгаспадарчасці.

Беларусь на II Еўрапейскіх гульнях прадставіць 227 спартсменаў.

Беларускія «Паланэзы» і «Кропкі» паразілі ўсе цэлі на стрэльбах у Казахстане.



Вялікі тэатр Беларусі правядзе дзень адкрытых дзвярэй 24 мая.

У кітайскім Шэньчжэні верталёты неўзабаве стануць грамадскім транспартам.

Ва Узбекістане запушчана ўстаноўка, якая генерыруе ваду з паветра.

Пётр Парашэнка падпісаў закон аб украінскай мове як адзінай дзяржаўнай. Дзеянне закона не распаўсюджваецца на сферу прыватных зносін і здзяйснення рэлігійных абрадаў.

ISSN 1990 - 763X

Соцыум

ДАГЛЕДЗЕЦЬ БЛІЗКАГА ЧАЛАВЕКА

Некаторым гэта каштуе работы. Якія яшчэ ёсць варыянты дапамогі сям'і?

З такой праблемай многія нярэдка сутыкаюцца падчас актыўнай працоўнай дзейнасці. Аднойчы паўстае пытанне — пакінуць работу альбо знайсці нейкія іншыя спосабы, каб годна дагледзець старога і хворага роднага чалавека. У кожнага з нас, у нашых сяброў і знаёмых ёсць свае гісторыі на гэты конт. І сваё меркаванне.

Жыццёвыя гісторыі

Напрыклад, на маіх вачах адна калега, супрацоўніца абласной газеты, крыху больш за год разрывалася паміж працай і домам, дзе ляжала хворая маці. Яны з мужам па чарзе двойчы на дзень прыязджалі дадому. Ён дамовіўся з кіраўніцтвам, яму зрабілі абедзенны перапынак з 11 да 12 гадзін, ёй, адпаведна, з 12.30 да 15.30. Так яны ездзілі штодня, кармілі хворую, мянялі памперсы. А калі няма магчымасці рэгуляваць рабочы дзень альбо работа знаходзіцца даволі далёка ад дому? Яшчэ адны знаёмыя наймалі прыватную сядзелку, на што ішла не толькі пенсія старога бацькі, але амаль што і зарплата яго дачкі. Для многіх таксама не выйсце.

СТАР. 4

Да 75-годдзя ВЫЗВАЛЕННЯ 1944 2019

Няпраўда, што моладзь не цікавіцца ваеннай тэмай...

Рэдактар аддзела пісьмаў газеты «Пухавіцкія навіны» Наталля ПАРХОМЧЫК.

У рэдакцыю да нашых калег прыйшоў ліст з Выбарга Ленінградскай вобласці, аўтар якога прасіў знайсці хоць якія звесткі пра родных. Ён нарадзіўся ў вёсцы Сінча Мінскай вобласці, але ў вайну ў 4-гадовым узросце разам з матуляй пакінуў тыя мясціны. Яго маці не любіла расказваць пра тыя часы, а сам Іван Фёдаравіч нічога не памятаў.

СТАР. 13

Парламенцкі дзённік

Узровень высокі, але імкнёмся да большага

Учора старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір Андрэйчанка сустрэўся з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом ФРГ у нашай краіне Петэрам Дэтмарам, які зусім хутка заканчвае сваю місію ў Беларусі.

Спікер ніжняй палаты беларускага парламента падкрэсліў: пасол унёс вельмі вялікі асабісты ўклад ва ўмацаванне і актывізацыю двухбаковага супрацоўніцтва па ўсіх напрамках — ад эканомікі да культуры. «Але вы вялікі ўклад унеслі таксама і ў нармалізацыю адносін з Еўрапейскім саюзам, і ў развіццё далейшага палітычнага дыялогу, за што мы таксама ўдзячныя», — дадаў Уладзімір Андрэйчанка. Па словах старшыні Палаты прадстаўнікоў, Беларусь зацікаўлена ў развіцці адносін з ЕС.

Яшчэ спікер адзначыў колькасць візітаў у нашу краіну нямецкага кіраўніцтва, у тым ліку і прэзідэнта, віцэ-канцлера. «Вядома, мы асабліва вітаем аднаўленне міжпарламенцкіх кантактаў», — падкрэсліў ён.

Таксама Уладзімір Андрэйчанка заклікаў развіваць супрацоўніцтва Беларусі і Германіі на міжнародных пляцоўках.

Што датычыцца гандлёва-эканамічных адносін, старшыня Палаты прадстаўнікоў заўважыў, што лічбы тут значна ўзраслі за апошнія гады, але ёсць куды імкнуцца.

Яшчэ для Беларусі асабліва важны інвестыцыйны імпарт, які паступае з Германіі, дадаў ён. Таксама Уладзімір Андрэйчанка высока ацаніў уклад пасла ў справу пераадолення наступстваў чарнобыльскай катастрофы ў гуманітарным плане: толькі за мінулы год каля 2600 юных беларускіх грамадзян прайшлі аздараўленне і лячэнне ў Германіі.

У адказ Петэр Дэтмар падзякаваў Уладзіміру Андрэйчанку за дружалюбныя словы ў свой адрас. Ён падкрэсліў, што ў сваёй дзейнасці ў Беларусі для яго на першым месцы заўсёды стаялі і стаяць людзі.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

Партнёрства

Пастаўкі малака і мяса — на кантролі

Пытанні гандлю з Расіяй не знікаюць з парадку дня і кантралююцца Саюзнай дзяржавай

Балансы паставак арыентуюць сельгасвытворцаў, на які аб'ём збыту прадукцыі можна разлічваць. Гэтую функцыю падкрэсліў дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Рыгор РАПОТА, размаўляючы з журналістамі перад сумесным пасяджэннем калегій Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі і Міністэрства сельскай гаспадаркі Расіі.

Дзяржсакратар адзначыў, што балансы маюць індыкатыўны, арыенціровачны характар, але абодва бакі імкнуцца іх прытрымлівацца: «Зацвярджэнне паказчыкаў — заўсёды адказны акт, штогод вядуцца спрэчкі паміж прадстаўнікамі міністэрстваў сельскай гаспадаркі. Сёння, як я ўяўляю, згода дасягнутая па ўсіх асноўных пазіцыях».

Пастаянны камітэт сочыць, каб пытанні ўрэгулявання спрэчак па малаку і мясе не знікалі з парадку дня зацікаўленых міністэрстваў і ведамстваў, каб спецыялісты не забываліся на важнасць гэтай праблемы. «Супярэчнасці ўзнікаюць непазбежна, і не толькі ў сферы сельскай гаспадаркі. Наша задача — не пакінуць іх без вырашэння», — адзначыў дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы.

Сярод самых актуальных сучасных напрамкаў развіцця Рыгор Рапота назваў стварэнне селекцыйных цэнтраў, узмацненне работы ў генетыцы жывёлагадоўлі, вывядзенне новых сартоў і пародаў. Пастаянны камітэт чакае прапаноў ад аграрыяў — прычым ужо ўзгодненых у адпаведных міністэрствах.

Расія і Беларусь сумесна вырашаюць задачы не толькі ў сельскай гаспадарцы. Зараз у дзвюх краінах ажыццяўляюцца медыцынская праграма па спінальных сістэмах і праграма па ДНК-ідэнтыфікацыі. Дзейнічаюць сумесныя праекты ў галінах мікраэлектронікі, засваення космасу. У выніку рэалізацыі праграмы па ліквідацыі наступстваў чарнобыльскай катастрофы створана тры медыцынскія цэнтры. «Ідэй у нас болей за магчымасці для іх рэалізацыі, — звярнуў увагу дзяржсакратар. — Грошай няшмат, але іх выкарыстанне добра разлічанае. Усё ідзе на карысць».

Па словах кіраўніка Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы, усе сумесныя праграмы Беларусі і Расіі паспяхова выконваюцца і маюць практычны вынік. Часам рэзультат складае сто, часам — 95 %, а часам і перавышае сотню працэнтаў. «Здавальняючы вынік магчымы толькі пры адной умове: калі пільна прапрацоўваюцца ўсе дэталі, звязаныя з падрыхтоўкай праграмы», — выказаў упэўненасць Рыгор Рапота і назваў працэс падрыхтоўкі «пакутлівым», бо ён можа заняць да двух гадоў.

Варвара МАРОЗАВА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Сі Цзіньпін заявіў, што цывілізацыі свету павінны раўнапраўна ставіцца адна да адной

Чалавечыя цывілізацыі розных рэгіёнаў свету павінны адмовіцца ад канфліктаў і раўнапраўна ставіцца адна да адной. Пра гэта на цырымоніі адкрыцця форуму «Дыялог азіяцкіх цывілізацый» у кітайскай сталіцы заявіў старшыня КНР Сі Цзіньпін. «Цывілізацыі адрозніваюцца адна ад адной гэтак жа, як і людзі маюць розныя колеры скуры ці гавораць на розных мовах. Ні адна з цывілізацый не валодае больш высокім статусам над іншымі. Меркаванне, што адна раса або цывілізацыя вышэй за іншыя, невуцкае, а дзейнічаць згодна з такім мысленнем зусім пагібельна. Калі чалавечыя цывілізацыі будуць зведзены толькі да аднаго колеру або мадэлі, то свет стане аднатонным і бессэнсоўным», — дадаў Сі Цзіньпін. Як адзначыў старшыня КНР, краіны свету павінны заставацца адкрытымі і ствараць умовы для працвітання іншых цывілізацый. «Трэба паважаць іншых, лічыць роўнымі сабе, а таксама адкінуць пыху і прадузятасць», — падкрэсліў ён. Як лічыць Сі Цзіньпін, цывілізацыі не павінны сутыкацца паміж сабой. Форум «Дыялог азіяцкіх цывілізацый» праходзіць у Пекіне 15—16 мая. У ім бяруць удзел больш за дзве тысячы прадстаўнікоў з 47 краін і рэгіёнаў свету.

Адноўлена поўная карціна катастрофы SSJ-100 у Шарамеццеве

Як вядома, самалёт Sukhoi Superjet 100 «Аэрафлота», які выконваў рэйс з Масквы ў Мурманск, 5 мая ўвечары экстранна вярнуўся ў Шарамеццева і здзейсніў жорсткую пасадку пасля 28 хвілін палёту. Пры пасадцы ў яго падламаліся стойкі шасі і загарэліся рухавікі. Паводле інфармацыі Гідраметцэнтра Расіі, у той дзень у Падмаскоўі назіралася навальніца. Пасля ўдару маланкі ў самалёт, борт страціў радыёсувязь з дыспетчарам. У салоне знаходзіліся 73 пасажыры і пяць членаў экіпажа. 41 чалавек загінуў, уключаючы бортправадніка. Эксперты, якія расследуюць крушэнне самалёта SSJ 100 у Шарамеццеве, цалкам аднавілі храналогію падзей, што прывялі да трагедыі. Пра гэта паведаміў «Коммерсант» са спасылкай на блізкую да расследавання ананімную крыніцу. Як адзначыў эксперт, да рэзкай пасадкі і пажару на борце прывялі памылкі пілотаў. Маланка, якая ўдарыла ў самалёт, адключыла аўтаматыку на Superjet, але не стварыла крытычную сітуацыю. Адна з памылак экіпажа заключаецца ў тым, што яны працягнулі пасадку пасля таго, як самалёт здзейсніў серыю скачкоў на ўзлётна-пасадачнай паласе. Эксперты лічаць, што спробы экіпажа пасадзіць лайнер ужо пасля ўзнікнення «казла» сталі фатальнай памылкай. Цяпер следству трэба вызначыць, які з двух пілотаў здзейсніў небяспечныя дзеянні перад пасадкай. На гэта спатрэбіцца пэўны час, паколькі кіраванне лайнерам ажыццяўляецца з дапамогай джойсцікаў, якімі пілоты перадаюць каманды ў бартавы камп'ютар.

Іран перастаў выконваць умовы ядзернай здзелкі

Улады Ірана афіцыйна прыпынілі выкананне некаторых абавязацельстваў па ядзернай праграме, прадугледжаных Сумесным усёабдымным планам дзеянняў (СУПД). Пра гэта са спасылкай на мясцовыя СМІ паведаміла інфармагенцтва Reuters. Цяпер Тэгеран можа аднавіць работы па ўзбагачэнні ўрану і продажы яго за мяжу, а таксама спыніць мадэрнізацыю рэактара на цяжкай вадзе. Улады Ісламскай Рэспублікі заявілі, што пойдуць на гэтыя крокі, калі іншыя ўдзельнікі здзелкі не даб'юцца выканання ўмоў пагаднення на працягу 60 дзён. Паведамляецца, што прычынай такога рашэння ў Іране называюць парушэнні ядзернай здзелкі з боку ЗША і амерыканскія санкцыі. Астатнія члены СУПД — Германія, Францыя, Вялікабрытанія, Кітай і Расія — павінны, на думку іранскіх улад, вырашыць гэтую праблему ў найбліжэйшы час. Пра тое, што Іран збіраецца «спыніць выкананне шэрагу абавязацельстваў» у межах пагаднення аб ядзернай праграме, стала вядома 8 мая. Тады ж паведамлялася і аб тэрміне ў 60 дзён, які паставілі краінам, што не выйшлі з пагаднення.

У ЧЫМ ПАТЭНЦЫЯЛ ПОЎНАЧЫ?

Якія планы задумана ажыццявіць на Віцебшчыне, што прываблівае сюды інвестараў і якой ініцыятывы не хапае аршанцам? Аб гэтым журналістам падчас нядаўняй прэс-канферэнцыі расказаў старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай ШАРСНЁЎ.

Ініцыятыўным — зялёнае святло

Адказваючы на пытанні прадстаўнікоў СМІ, губернатар нямала ўвагі ўдзяліў Аршанскаму раёну, у прыватнасці, расказаў, што ўсё больш бізнес-структур з іншых абласцей выказваюць пажаданне стварыць там прадпрыемства. І гэта зразумела, бо гарантуюцца прывабныя прэферэнцыі, якія робяць бізнес вельмі прыбытковым. А ўмовы на тэрыторыі мультымадальнага прамыслова-лагістычнага комплексу «Брэміна-Орша» ў пасёлку Балбасава, нават лепшыя, чым у свабоднай эканамічнай зоне. Таму там выгадна працаваць як сярэдняму, так і вялікаму бізнесу. А на што можа разлічваць малы, дзе заняты адзін ці некалькі чалавек? Кіраўнік абласной вертыкалі ўлады ўпэўнены, што ёсць вялікі патэнцыял і для дробных прыватнікаў. Але, на яго думку, самі жыхары раёна пакуль не ўсвядомілі, што з'явіўся ўнікальны шанц праявіць дзелавыя якасці і зарабіць. Можна распачаць бізнес самастойна, стварыць сваю справу з сябрамі, калегамі. Гарантаваны поспех і таму, што ў Аршанскім раёне параўнальна шмат жыхароў: больш за 156 тысяч чалавек, у Оршы каля 115 тысяч. І гэта — патэнцыйныя пакупнікі, спажыўцы паслуг. Проста трэба прыкласці намаганні, каб зарабіць. Губернатар нагадаў, што Указ Прэзідэнта № 506, накіраваны на развіццё Аршанскага раёна, і быў прыняты, каб спрыяць развіццю бізнес-ініцыятывы мясцовых жыхароў, рэалізаваць іх дзелавы, працоўны патэнцыял. Падаткі сімвалічныя, зялёнае святло пры пакупцы і арэндзе памяшканняў, табу на праверкі з боку кантрольных органаў... Аб такім у іншых рэгіёнах толькі мараць.

З боку ўлады зроблена і робіцца ўсё магчымае, каб ствараліся новыя вытворчасці, рабочыя месцы. А вось ініцыятывы з боку тутэйшых пакуль малавата. Мікалай Шарснёў упэўнены: з часам людзі ацэняць сітуацыю, і яна зменіцца.

Ад поля да прылаўка

Наконт стратэгіі развіцця вёсак Аршаншчыны і поўначы краіны ў цэлым — і аб гэтым таксама ішла гутарка. Старшыня аблвыканкама нагадаў аб канцэпцыі стварэння інтэграцыйных структур аграрнага вытворчага комплексу. Аршанская — адна з чатырох такіх у вобласці (яшчэ — Віцебская, Полацкая і Глыбоцкая). Мікалай Шарснёў упэўнены, што Віцебшчына — першапраходзец у стварэнні буйных комплексаў — у свой час правільна пачала ўзмацняць наймацнейшых. Некалькі гадоў таму тут пачалі ствараць кааперацыю па прынцыпе «ад поля да прылаўка». Ён апраўдаў сябе: гаспадаркі, якія ледзь зводзілі канцы з канцамі, атрымалі шанец другога нараджэння. Ды і перадавікі, сельскагаспадарчыя гіганты, перапрацоўшчыкі нічога не страцілі. Ім і сёння аказваецца падтрымка на ўзроўні кіраўніцтва аблвыканкама. Напрыклад, прапанавалі зямлю стратных раней гаспадарак, ёсць магчымасць без цяжкасцяў набыць новую тэхніку, угнаенні ды іншае. Змяншаюцца выдаткі, акумулююцца даходы — плюсоў больш, чым мінусаў.

Дырэктывай № 6 кіраўніка дзяржавы прадугледжвацца якраз фарміраванне інтэграцыйных сельскагаспадарчых структур. На сёння абароты ўражваюць. Напрыклад, з 800 тысяч гектараў раллі прыкладна 450 тысяч апрацоўваюць холдынгі.

Інвестараў усё больш

Сёлета ў Мёрскім раёне плануецца прэзентаваць новую ўнікальную вытворчасць — завод па перапрацоўцы металу. Там будуць вырабляць белую бляху. Старшыня аблвыканкама падкрэсліў, што аб'ём інвестыцый вельмі сур'ёзны — каля 300 мільёнаў долараў. Па сутнасці, увесь раён стане больш актыўна развівацца: мясцовыя жыхары атрымаюць рабочыя месцы, якія адпавядаюць перадавым стандартам, дзе можна будзе годна зарабляць.

Паколькі паўночная частка Беларусі вельмі багатая лясамі, робіцца стаўка на прыцягненне інвестараў у галіну апрацоўкі. Мікалай Шарснёў расказаў пра літоўскую фірму, якая з'яўляецца буйным гульцом на рынку перапрацоўкі драўніны. Замежнікі на тэрыторыі свабоднай эканамічнай зоны «Віцебск» будуць вырабляць запатрабаваную ў краінах Еўрапейскага саюза прадукцыю. Вытворчасць забяспечаць рабатызаваным абсталяваннем. А выручку з разліку на аднаго рабочага плануюць атрымаць у дзясяткі разоў вышэйшую, чым у іншых вытворцаў. Цяпер пры ўдзеле інвестараў можна больш актыўна зарабляць на паглыбленай перапрацоўцы. Дарэчы, калісьці ў кожным лясгасе развівалі вытворчасць, і гэта сябе апраўдвала.

А яшчэ поўнач краіны багата вадой, карыснай для здароўя, сапрапелем, торфам, тут дзясяткі гадоў здабываюць даламіт... Таму інвестарам ёсць што прапанаваць і з карысных выкапняў. Але пры гэтым акцэнт робіцца на выпуск канечнай прадукцыі з высокай дабаўленай вартасцю.

Мясцовая ўлада павінна зацікавіць інвестараў, якія маглі б сур'ёзна паўплываць на аздараўленне эканомікі кожнага рэгіёна. І такіх прыкладаў усё больш і больш.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

MILEX-2019

МАШТАБНЫ АГЛЯД НАВІНАК

Упершыню каля ста ўзораў новага ўзбраення прадэманструе беларуская абаронка

У Мінску пачала работу 9-я Міжнародная выстаўка ўзбраення і ваеннай тэхнікі MILEX-2019. За тры дні экспаненты прадэманструюць на пляцоўцы «Мінск-Арэны» свае дасягненні ў абарона-прамысловай галіне і навінкі ваеннай і спецыяльнай тэхнікі.

Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

Як адзначылі ў Дзяржаўным ваенна-прамысловым камітэце Рэспублікі Беларусь, нягледзячы на свой адносна невялікі ўзрост, па маштабах задач, якія вырашаюцца, складзе і ўзроўні ўдзельнікаў MILEX з'яўляецца адной з найбуйнейшых выставак узбраення ва Усходне-Еўрапейскім рэгіёне. За кароткі тэрмін яна набыла рэпутацыю сур'ёзнага міжнароднага зброевага салона.

Афіцыйная цырымонія адкрыцця адбылася на тэрыторыі гісторыка-культурнага комплексу «Лінія Сталіна», дзе гледачам паказалі яркае, відовішчнае шоу на зямлі і ў паветры. Сцэнарый адкрыцця выстаўкі, у тым ліку і ваенна-гістарычная рэканструкцыя баявога эпізоду на безыменнай вышыні, прысвечаны 75-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Фармат выстаўкі ўзбраення і ваеннай тэхнікі MILEX чарговы раз пацвярджае адкрытасць нашай краіны, яе зацікаўленасць у развіцці супрацоўніцтва з іншымі дзяржавамі ў сферы забеспячэння бяспекі. Пра гэта гаворыцца ў прывітанні Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ўдзельнікам і гасцям выстаўкі, яго зачытаў прэм'ер-міністр Сяргей Румас, перадае БелТА. «На гэтым прадстаўнічым форуме традыцыйна дэманструюцца асноўныя тэндэнцыі фарміравання сусветнага рынку зброі, а таксама найноўшыя дасягненні вядучых беларускіх і замежных вытворцаў прадукцыі ваеннага прызначэння», — адзначаецца ў прывітанні.

Форум дэманструе інтэлектуальную моц і велізарны патэнцыял айчыннага абароннага сектара эканомікі. Пра гэта заявіў начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл — першы намеснік міністра абароны Беларусі Алег Белаконеў. Дынаміка павелічэння колькасці ўдзельнікаў і наведвальнікаў сведчыць пра рост аўтарытэту і папулярнасці выстаўкі ў прафесійным асяроддзі, адзначыў ён.

На выставачнай пляцоўцы «Мінск-Арэны» свае экспазіцыі дэманструюць каля 170 арганізацый з 10 краін, што прадстаўляюць найбуйнейшых вытворцаў і экспарцёраў абароннай прадукцыі і паслуг з Беларусі, Расіі, Азербайджана, Польшчы, Германіі, Кітая ды іншых. Асобным стэндам прадстаўлены магчымасці дзяржаў — членаў АДКБ. Агульная плошча экспазіцыі ў выставачным павільёне складае 8 тысяч «квадратаў», на адкрытай пляцоўцы — 10 тысяч. Упершыню ў выстаўцы ўдзельнічаюць кампаніі з Сербіі і ЮАР, а таксама міністэрства абароннай прамысловасці Азербайджана.

Як паведамілі ў ДВПК, беларуская абаронка ўпершыню прадэманструе ўзоры прыкладна ста адзінак узбраення. Сярод праектаў — сродкі агнявога паражэння, сістэмы комплекснага процідзеяння высокадакладнай зброі, сродкі перамяшчэння, беспілотныя авіяцыйныя комплексы і баявыя геаінфармацыйныя сістэмы.

Ул. інф.

ТРЫ ФАН-ЗОНЫ

...і 20 дадатковых інфармацыйных пунктаў для турыстаў

Як паведаміла вядучы спецыяліст аддзела сэрвісаў для гледачоў фонду «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года» Людміла ФАКЕЕВА, першыя інфапункты адкрыюцца за некалькі дзён да пачатку Гульняў, каб госці, якія прыбылі загадзя, змаглі тут атрымаць інфармацыйную падтрымку.

У гэтых пунктах валанцёры прапануюць усім ахвотным рэкламныя і інфармацыйныя матэрыялы, бясплатныя турыстычныя карты, дзе пазначаны культурныя і гістарычныя месцы і славутасці горада. Яны падкажуць, як дабрацца да гасцініцы або спартыўных аб'ектаў. Інфапункты каля спарткомплексаў будуць працаваць па раскладзе спаборніцтваў, у раёне аб'ектаў транспартнага абслугоўвання (на вакзалах, аэрапорце) яны адкрыюцца за некалькі дзён да пачатку Гульняў і закрыюцца праз некалькі дзён пасля іх завяршэння.

Начальнік галоўнага ўпраўлення спорту і турызму Мінгарвыканкама Міхаіл ПРАКАПЕНКА адзначыў, што ўсе аб'екты Гульняў знаходзяцца ў высокай ступені гатоўнасці, на іх праводзяцца тэставыя спаборніцтвы.

«На час Гульняў у Мінску з'явяцца тры фан-зоны: каля Палаца спорту, «Мінск-Арэны» і «Чыжоўка-Арэны», — заявіла **начальнік аддзела грамадскага харчавання галоўнага ўпраўлення спажывецкага рынку Мінгарвыканкама Вольга ЕЗАПЕНКАВА.** Тут можна будзе пакаштаваць прадукцыю хуткага прыгатавання, прапанаваную сталічнымі прадпрыемствамі. Так, у фан-зоне каля «Мінск-Арэны» будуць пяць фудтракаў і пяць палатак розных аб'ектаў грамадскага харчавання. На «Чыжоўка-Арэне» створаць больш за 500 пасадачных месцаў для балельшчыкаў. Дарэчы, ва ўсіх гандлёвых палатках прапануюць, акрамя таго, стравы беларускай нацыянальнай кухні. Усяго ж на 15 спартыўных аб'ектах арганізуюць гандлёвае абслугоўванне 96 стацыянарных і часовых пунктаў.

А вось у фан-зоне каля Палаца спорту размесцяцца 14 аб'ектаў харчавання на 1000 месцаў. Карміць тут будуць рэстараны 11 пасольстваў.

Што датычыцца спартсменаў, якія прыедуць у Мінск і размесцяцца ў Студэнцкай вёсцы, то яны змогуць харчавацца ў сталовай, якая часова пераабсталявана на дзве тысячы месцаў. Акрамя таго, гэтая сталовая ў дні спаборніцтваў прапануе стравы міжземнаморскай, італьянскай, рускай і беларускай кухняў, а таксама спартыўнае харчаванне. Таксама тут з'явіцца кафэ выключна з нашымі нацыянальнымі стравамі, разлічанае на 150 месцаў.

А вось **намеснік дырэктара ДП «Сталічны транспарт і сувязь» Андрэй ІЛАРЫЁНАЎ** лічыць, што праца па арганізацыі транспартнага руху на час спаборніцтваў пачалася яшчэ ў мінулым годзе. Зараз ужо дакладна вызначана, якім чынам будуць працаваць метро і наземны транспарт падчас правядзення Гульняў.

Тры маршруты стануць абслугоўваць гледачоў «Мінск-Арэны», іх будуць падвозіць да станцый метро «Пушкінская», «Няміга» і «Акадэмія навук». Яшчэ два маршруты злучаць «Чыжоўка-Арэну» і станцыю метро «Аўтазаводская», стралковы комплекс і станцыю метро «Уручча». Графік руху сфарміраваны з улікам раскладу спаборніцтваў. Таксама зменіцца работа транспарту ў раёне фан-зон, зарэзерваваны дадатковы рухомы састаў па дзеючых маршрутах. Распрацавана схема руху ў перыяд правядзення велагонкі.

Гарадскія ўлады наколькі магчыма кампенсавалі тыя нязручнасці, якія ўзнікнуць у сувязі з закрыццём вуліц. Асаблівая ўвага аддаецца інфармаванню грамадзян. У сувязі з тым, што фан-зона каля Палаца спорту ў асобныя дні будзе працаваць да чатырох раніцы, станцыі метро зачыняцца для ўваходу ў 4 гадзіны 10 хвілін. Работа метрапалітэна падаўжаецца да 4.30, наземнага транспарту — да пяці раніцы.

Як вядома, удзельнікам Гульняў дадуць права бясплатнага праезду на гарадскім пасажырскім транспарце і метрапалітэне пры наяўнасці ў іх дзеючай акрэдытацыйнай карты. Плаціць за праезд балельшчыкі будуць па цяперашняй сістэме аплаты праезду ў Мінску, а таксама з выкарыстаннем карткі госця, а ў метрапалітэне — яшчэ і банкаўскай карткі. Для транспартнага абслугоўвання ўдзельнікаў гульняў у спартыўнай вёсцы абсталяваны часовы пасажырскі тэрмінал, які будзе ўключаць пасадачныя пляцоўкі, абсталяваныя павільёнамі і інфармацыйнымі табло.

У нашай сталіцы завяршаецца распрацоўка агульнагарадской схемы, дзе будуць пазначаныя ўсе месцы для паркоўкі транспарту пры правядзенні спаборніцтваў II Еўрапейскіх гульняў, паведаміў **галоўны інжынер дзяржаўнага аб'яднання «Гаражы, аўтастаянкі, паркоўкі» Пётр ПРУДНІКАЎ.** Схема будзе размешчана ў сродках масавай інфармацыі і на аўтастаянках аб'яднання. Папярэдне для абслугоўвання гледачоў вызначана каля 7 тысяч месцаў у раёне правядзення спаборніцтваў і каля 10 тысяч месцаў па напрамках руху.

Сяргей КУРКАЧ.

Ёсць кантакт!

БЕЛАРУСЬ — У ФІНАЛЕ

У аўторак у Тэль-Авіве прайшоў першы паўфінальны канцэрт «Еўрабачання-2019». З 17 яго ўдзельнікаў па выніках галасавання гледачоў і журы барацьбу працягнуць толькі 10, у тым ліку прадстаўніца Беларусі. Таксама шчаслівыя білецікі атрымалі прадстаўнікі Грэцыі, Кіпра, Сербіі, Эстоніі, Чэхіі, Аўстраліі, Ісландыі, Сан-Марына і Славеніі.

Першая дзясятка фіналістаў.

Фота БелТА.

Для Беларусі гэта шосты выхад у фінал найбуйнейшага песеннага шоу Еўропы за ўвесь час. Раней прабіцца скрозь сіта папярэдняга адбору ўдавалася Дзмітрыю Калдуну ў 2007 годзе (яго выніковае 6-е месца ў фінале конкурсу застаецца самым вялікім дасягненнем беларускіх артыстаў), гурту «3+2» у 2010-м, Алене Ланской і Тэа ў 2013 і 2014 гадах адпаведна, а таксама гурту Naviband у 2017-м. Таму, як ні круці, цяперашні вынік — ужо ўдача, тым больш напярэдадні конкурсу многія ацэньвалі шанцы беларускі ЗЕНЫ скептычна. Аднак песня «Like It» спадабалася еўрапейскім гледачам і суддзям у дастатковай ступені, каб цяпер замахвацца на нешта большае. «Дзякуй усім, хто адправіў свае галасы ў падтрымку, і да сустрэчы ў фінале!» — напісаў у сацыяльных сетках прадзюсар спявачкі Віктар Дробыш. Паводле жараб'ёўкі, ЗЕНА выступіць 18 мая ў другой палове музычнага шоу.

Сёння пройдзе другі паўфінальны канцэрт, у якім бяруць удзел артысты і калектывы з Арменіі, Ірландыі, Малдовы, Швейцарыі, Латвіі, Румыніі, Даніі, Швецыі, Аўстрыі, Харватыі, Мальты, Літвы, Расіі, Албаніі, Нарвегіі, Нідэрландаў, Паўночнай Македоніі і Азербайджана. Між іншым, менавіта ў гэтай групе знаходзяцца тры канкурсанты, якіх букмекеры разглядаюць як найбольш верагодных пераможцаў «Еўрабачання», а таму страсці чакаюцца нежартоўныя. Зрэшты, пасля ўчарашняга канцэрта расклад сіл крыху змяніўся, і ў патэнцыйную пяцёрку лідараў уварвалася Кейт Мілер-Хайдке з Аўстраліі, якая пасунула з п'едэстала, пакуль што ўяўнага, прадстаўніка Расіі Сяргея Лазарава. Як будзе насамрэч, даведаемся ў ноч з 18 на 19 мая, а пакуль што глядзім другі канцэрт «Еўрабачання», у якім мы не галасуем, а проста атрымліваем задавальненне.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Абітурыент-2019

ІЛАН МАСК І БІЛ ГЕЙТС... У БНТУ

Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт запрашае абітурыентаў стаць студэнтамі на адзін дзень. 18 мая ва ўсіх старшакласнікаў будзе магчымасць адчуць сябе інжынерам, канструктарам, праграмістам, эканамістам і нават архітэктарам.

Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт арганізуе для патэнцыйных абітурыентаў экскурсію па вучэбных карпусах, сталовых, у Навуковую бібліятэку і спартыўны комплекс з басейнам (пачатак у 10.00). Таксама на пляцоўцы перад галоўным корпусам з 9.00 да 10.00 будзе арганізавана бясплатная фотазона, дзе школьнікі змогуць выйграць прыемныя прызы і сфатаграфавацца з «гасцямі» ў асобе Ілана Маска, Ціма Кука, Біла Гейтса і іншых.

Далейшая праграма ўключае лекцыйныя, практычныя і лабараторныя заняткі на любы густ. Напрыклад, можна будзе праслухаць лекцыю пра крэатыўную ўпакоўку ці тэхналогіі будучыні на транспарце, куды коціцца IT-свет, па інжынернай эканоміцы, аўтаномным кіраванні мабільнымі тэхналагічнымі комплексамі, інавацыйнай эканоміцы і іншыя. Кагосьці зацікавіць майстар-клас «Афармі ўпакоўку да свята», па 3D-мадэляванні, стварэнні мабільных інтэлектуальных міні-робатаў. Будучым эканамістам карысна будзе паўдзельнічаць у дзелавой гульні «Распачні свой шлях да поспеху» ці гульні па бізнес-планаванні.

Абітурыентаў сустрэнуць у фае галоўнага корпуса з 9 гадзін раніцы. З больш падрабязнай праграмай мерапрыемства «Адзін дзень студэнта БНТУ» можна азнаёміцца на сайце ВНУ.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ДАГЛЕДЗЕЦЬ БЛІЗКАГА ЧАЛАВЕКА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Гэтую гісторыю давялося пачуць у адной з апошніх камандзіровак. У Ніны, назавём яе так, добрая сям'я, можна сказаць, тыповая для простых працавітых жыхароў райцэнтра сярэдніх гадоў. Яны з Анатолем пажаніліся даволі маладымі, нарадзілі дваіх дзяцей, пабудавалі кватэру ў горадзе. Ён працуе ў будаўніча-меліярацыйнай арганізацыі, яна працавала ў паштовай сувязі. Раней тыдзень шчыравалі на асноўнай рабоце, у выхадныя ехалі ў вёску, дапамагалі бацькам мужа. Ну і вядома, мелі ад іх харчовую дапамогу, інакш цяжка было б і крэдыты аплачваць, і дзяцей паднімаць. Ніна цяпер успамінае нябожчыцу-свякроў добрым словам. Раней, праўда, не заўсёды разумела, калі тая бурчэла на мужа. Ён умудраўся на выхадных трымаць форму, а свае п'яныя грахі пакідаў на будныя дні. Незадоўга да смерці маці цяжка ўздыхала, маўляў, намучыцеся вы з ім.

Пасля смерці гаспадыні дома гаспадар зусім адчуў вольніцу. І ці не ў першы выхадны нявестцы патэлефанавалі з другога канца вёскі: забірай свёкра. Яна ледзьве выцягнула з канавы п'янага чалавека, з цяжкасцю прывалакла дадому. Мужа не было, ён працаваў тады вахтавым метадам. А наступны раз такая п'янка скончылася наогул дрэнна, кровазліццём у мозг. Невядома яшчэ, колькі праляжаў на падлозе, сабутэльнікі патэлефанавалі дзецям, калі самі прачнуліся раніцай.

Ніна з Анатолем прыехалі хутка, вёска побач з райцэнтрам, убачылі сінія ногі бацькі. Падумалі, што падаў ды пабіўся. Не адразу з гэтай прычыны «хуткую» выклікалі. Потым урачы сказалі, што хвароба праяўляецца і так. Адным словам, выйшаў з бальніцы ён канчатковым інвалідам. Ніна пакінула работу, яны з мужам пераехалі ў бацькоўскі дом. Бацьку яны падлячылі, фізічна ён стаў актыўным, а вось свядомае стаўленне да жыцця так і не вярнулася. Цяпер яна толькі бегае за ім ды ўстараняе ўсе праяўленні шкодніцтва, як за малым дзіцем: то тыднёвы запас курынага корму высыпле за раз, то цяпліцу раскрые і плёнку выкіне. Калі такое здараецца раз-другі, можна сцярпець, а калі кожны дзень, тыдзень за тыднем, месяц за месяцам і ўжо год за годам, то, вядома, нервы здаюць, сваё здароўе пачынае даваць збоі. А ёй трэба думаць і пра сваю пенсію, гэта значыць, варта было б уладкавацца на пастаянную работу. Але як быць з бацькам? Цікава, што сын адмовіўся перайсці ў ролю сядзелкі. Была такая магчымасць: у арганізацыі Анатоля пачаліся перабоі, нават вымушаныя адпачынкі за свой кошт былі. Стаж у яго дастатковы, яна тады прапанавала на сямейным савеце варыянт, што сама выйдзе на работу, а мужа аформіць на дапамогу па доглядзе інваліда. Ён сказаў, што ў яго не хопіць цярпення, ён можа сарвацца, накрычаць, а то і ўдарыць. І яна адступіла. Пакінула ўсё як ёсць.

Вось яшчэ адна гісторыя з камандзіровак. У 2003 годзе я пісала пра былую настаўніцу з пушчанскай вёскі Пружанскага раёна, па жыцці якой няўмольна прайшлося пасляваеннае перакройванне межаў. Гэта трагічна-шчымлівая гісторыя, але маё захапленне выклікала высокая годнасць гэтай жанчыны і тое, як яна расказвала пра горкі лёс сям'і мужа-нябожчыка, інтэлігента ў трэцім пакаленні. А некалькі гадоў таму зноў пабывала ў той вёсцы, і мне расказалі пра жыццёвы фінал маёй гераіні. Яна захварэла на хваробу Альцгеймера. Даглядаць яе прыехала дачка з Расіі, якая толькі дасягнула пенсійнага ўзросту. Маці хадзіла па вёсцы, прасіла хлеба ў людзей, несла поўную бязглуздзіцу, беспадстаўна вінаваціла дачку ва ўсіх грахах. А дачка ўсё гэта так блізка прымала да сэрца, што, пахаваўшы маці, менш чым праз год памерла сама. Усе як адзін у вёсцы лічаць, што Ульяна Пятроўна даканала дачку.

Сацыяльная падтрымка

На жаль, так бывае. Калі ў заходніх краінах усе пацыенты з падобнымі дыягназамі накіроўваюцца ў спецыялізаваныя пансіянаты, у нас вельмі часта заложнікамі хвароб бацькоў становяцца дзеці. Што рабіць, калі пажылога хворага чалавека пакінуць аднаго нельга, а з работы звальняцца таксама не выпадае? З гэтым пытаннем іду да **намесніка дырэктара Тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Маскоўскага раёна Брэста Ганны ЗАЛАЦЕНЬКАЙ.**

— Першая і самая галоўная форма дапамогі пажылым пенсіянерам — гэта абслугоўванне сацыяльнага работніка, які прыходзіць у дом альбо кватэру ад двух да пяці разоў на тыдзень, — гаворыць Ганна Георгіеўна. — У зоне абслугоўвання 53 сацыяльных работнікаў Маскоўскага раёна зараз налічваецца 447 пенсіянераў. У асноўным гэта людзі ва ўзросце 83—85 гадоў. А яшчэ ёсць аддзяленне сацыяльнай падтрымкі сям'і і дзяцей, дзе працуе 19 сядзелак для ляжачых хворых. І вось гэтыя сядзелкі часта становяцца падтрымкай сям'і альбо нават выратаваннем сітуацыі.

Загадчыца аддзялення сацыяльнай падтрымкі сям'і і дзяцей Таццяна ШЫКУНЕЦ паведаміла, што сядзелка ажыццяўляе догляд хворага чатыры гадзіны альбо восем гадзін у дзень, адпаведна — на палову стаўкі альбо на стаўку. Гэтая паслуга платная, плата складае рубель у гадзіну.

Сядзелкі — гэта штатныя супрацоўнікі тэрытарыяльнага цэнтра. Перад прыёмам на работу яны праходзяць медыцынскую камісію, правяраюцца нарколагам і псіхіятрам, праходзяць псіхалагічнае сумоўе і тэсціраванне. Усё пералічанае неабходна, каб адсекчы прыход выпадковых людзей. У іх абавязкі ўваходзіць поўны догляд хворага чалавека. Яны мяняюць памперсы і бялізну, мыюць хворага, гатуюць ежу і кормяць. Абавязковымі рысамі характару павінны быць талерантнасць і спагада. Старыя, нямоглыя людзі вельмі часта капрызныя, з неўралагічнымі і псіхічнымі праблемамі. Паводле слоў Таццяны Вадзімаўны, выпадковыя людзі, як правіла, адсейваюцца ў першыя месяцы работы, застаюцца тыя, хто мае цярпенне і любоў да людзей. Такіх у калектыве большасць, працуе нават адзін мужчына — Мікалай Крылоў.

Мікалай Аляксандравіч якраз з тых, хто сам страціў работу, калі давялося даглядаць блізкага чалавека. Потым уладкаваўся ў тэрытарыяльны цэнтр, цяпер яго называюць адным з найлепшых супрацоўнікаў аддзялення. У яго двое падшэфных, з якімі ён працуе па паўдня. Мужчына лічыць, што вельмі часта робіцца нерэальным застацца на рабоце некаму са сваякоў хворага. Скажам, калі твой блізкі чалавек пасля інсульту паралізаваны з дадатковым дыягназам «поўная страта асобы». І тады паслугі сядзелкі на тыя ж чатыры гадзіны — гэта хоць нейкая абарона члена сям'і, які даглядае, ад эмацыянальнага выгарання або псіхалагічнага знясілення.

Клопат дзяцей

Знаёмыя вярнуліся з Германіі. Расказвалі, як гасцілі ў адной сям'і. Гаспадарам дома за сорак, як і прынята на Захадзе, дзеці ў іх невялікія, вучні пачатковай школы. Малыя з задавальненнем наведваюць бабулю і дзядулю ў пансіянаце, які знаходзіцца даволі блізка ад дому. А састарэлыя бацькі перайшлі ў сацыяльную ўстанову таксама з задавальненнем. Пенсій хапае на аплату. А распарадак жыцця такі, што старыя людзі не сумуюць. Умовы там надзвычай камфортныя, у іх асобны пакой з кухняй і санвузлом накшталт блочнага інтэрната. Хочуць — гатуюць самі, не хочуць — могуць паесці ў агульнай сталоўцы. Заняткаў і забаў ва ўстанове на любы густ, пакуль ты рухаешся і актыўны, калі не — адпаведны догляд. У нас, відаць, яшчэ само грамадства павінна прайсці пэўны этап развіцця, пакуль саспее такі ўзровень забеспячэння дастойнай старасці. Вядома, і ў нас ёсць дамы-інтэрнаты для састарэлых. Але ж пажылыя людзі баяцца перспектывы правесці апошнія дні ў падобных установах. І не без падстаў баяцца, трэба сказаць. Усё больш разлічваюць на дзяцей.

А дзеці нярэдка адчуваюць сябе разгубленымі, не ведаюць нават, куды звяртацца ў першую чаргу, асабліва калі тэрмінова даводзіцца забраць хворых маці альбо бацьку з другога горада ці з вёскі. Таму перш за ўсё трэба пайсці ў тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнай дапамогі свайго раёна, даведацца пра парадак атрымання паслуг сацыяльнага работніка альбо сядзелкі. Гэтыя паслугі можна атрымаць па месцы жыхарства незалежна ад таго, дзе зарэгістраваны пажылы чалавек. Потым неабходна аформіць пакет дакументаў, першым з якіх будзе медыцынская даведка. Варта ўлічваць, што сядзелку выдзяляюць для ляжачых хворых. Калі догляд патрэбны пастаянна, варта разгледзець прапановы прыватнай сядзелкі, правільней сказаць, зверыць бюджэт, бо кошт прыватнага работніка перавышае кошт сацыяльнага ў разы, а то і ў дзясяткі разоў. І толькі пасля гэтага трэба прымаць канчатковае рашэнне аб сваёй далейшай рабоце.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона)
по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец), в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснёва Н. М.,
извещает о проведении 18 июня 2019 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб.	Шаг аукциона – 5 %, бел. руб.	Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб.
	Условие продажи: 1). Претендент на покупку (победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. 2). Действия по снятию с регистрационного учета транспортных средств, а также в случае необходимости получения регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца) производится Покупателем на основании выданной доверенности Продавцом, за его счет и его силами. Переоформление документов на автотехнику и механизмы производится за счет покупателя. 3). В соответствии с действующим Законодательством РБ (в части изменения подпункта 2.30 пункта 2 статьи 115 в Налоговом кодексе РБ с 1 января 2019 года) реализация имущества осуществляется без учета НДС 20 %			
1	**Лот № 1 в составе: капитальное строение с инв. № 320/С-15003,** общей площадью **9 504,4 кв. м,** назначение – здания специализированные для производства строительных материалов, складов, наименование – **одноэтажное панельное здание производственного корпуса КПД с пристроенными панельным зданием бетоносмесительного цеха КПД, панельным зданием склада, кирпичным зданием генераторной, с отдельно стоящими двумя зданиями моторного отделения с галереей, двух складов заполнителей с навесом, градирней, складом цемента, складом металла, открытым складом готовой продукции.** **Капитальное строение с инв. № 320/С-25829,** общей площадью **130,1 кв. м,** назначение – здание многофункциональное, наименование – **одноэтажное кирпичное здание зарядной станции со смотровой ямой. Капитальное строение с инв. № 320/С-25831,** общей площадью **289,7 кв. м,** назначение – здание специализированных складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **одноэтажное панельное здание склада столярных изделий. Капитальное строение с инв. № 320/С-25250,** общей площадью **207,6 кв. м,** назначение – здание нежилое, наименование – **одноэтажное кирпичное здание пожарного поста с каланчой, смотровой ямой. Капитальное строение с инв. № 320/С-25249,** общей площадью **1 450,6 кв. м,** назначение – здание нежилое, наименование – **двухэтажное кирпичное здание бытовых помещений, частично разукомплектованное, степень разрушения 35,3 %, с автомобильной дорогой. Капитальное строение с инв. № 320/С-24513,** общей площадью **5 841,7 кв. м,** назначение – здание специализированное для производства строительных материалов, наименование – **одноэтажное специализированное здание для производства строительных материалов из стеновых панелей и кирпича с одноэтажной кирпичной пристройкой, с пристроенными панельным одноэтажным зданием крановой эстакады, одноэтажным кирпичным зданием бетоносмесительного цеха ЖБИ № 1,одноэтажным панельным зданием хранилища, одноэтажной кирпичной пристройкой с пропарочными камерами, отдельно стоящими бетонной градирней, одноэтажным кирпичным зданием склада цемента с четырьмя емкостями, одноэтажным кирпичным зданием мостового отделения с галереей, бетонным складом заполнителей. Капитальное строение с инв. № 320/С-27446,** общей площадью **1 386,5 кв. м,** назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **административно-хозяйственное здание. Капитальное строение с инв. № 320/С-26350,** общей площадью **215,5 кв. м,** назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **здание компрессорной. Автомобильная дорога (инв. № 3618). Внутриплощадочные сети водопровода и канализации –** сети водопровода из асбестоцементных труб ВТ-3 при глубине заложения до 2 м, диаметром труб 50 мм, сети канализации из керамических труб при глубине заложения до 2 м, диаметром труб 150 мм (инв. № 3907). **Вертикальная планировка и благоустройство ограждение железобетонное из сплошных железобетонных плит на железобетонных столбах высотой 2,2 м (инв. № 3906). Информация о земельном участке: кадастровый номер 321882806101000074 общей площадью** 10,9326 га (право постоянного пользования). Целевое назначение земельного участка: для эксплуатации и обслуживания производственных зданий. **Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, Лукский с/с, п. Лукский, ул. Брикетная, д. 5	**752 620,00**	37 631,00	75 262,00
	Местонахождение лотов №№ 2–6: Гомельская обл., г. Чечерск, ул. Советская, 42			
2	Автомобиль грузовой специальный автобетоносмеситель «КАМАЗ 53229» ABS69361, кузов (рама) № XTC53229R72302894, X4869361N70074706, 2007 года выпуска, рег. знак АВ 1144-3, инв. № 2046. Туалетная кабина «Стандарт» (инв. № 5044)	**35 130,00**	1 756,50	3 513,00
3	Погрузчик-эксковатор А 310 ПЭ,базовое шасси «Беларусь 82», заводской № машины 80204468, 2008 года выпуска, рег. знак ЕВ-3 1166, инв. № 907а. Прицеп тракторный 2ПТС-4,5, заводской (серийный, идентификационный) № 8549АТ70000427, 2007 года выпуска, рег. знак ЕК-3 2883, инв. № 786	**19 800,00**	990,00	1 980,00
4	Автомобиль грузовой специальный автокран «МАЗ 6303А3» КС-55727-7, кузов (рама) № Y3M6303A380000689, Y3M55727780000916, 2008 года выпуска, рег. знак АВ 8940-3, инв. № 911. Приспособление для монтажа колонн (высота 2000 мм, сечение колон 600х600 мм), инв. № 00005009. Приспособление для монтажа колонн (высота 2000 мм, сечение колон 600х600 мм), инв. № 00005011. Приспособление для монтажа колонн (высота 2000 мм, сечение колон 600х600 мм), инв. № 00005010	**42 350,00**	2 117,50	4 235,00
5	Автомобиль грузовой самосвал «МАЗ-5551А2 325», кузов (рама) № Y3M5551A280000770, 2008 года выпуска, рег. знак АВ 7638-3, инв. № 813	**18 300,00**	915,00	1 830,00
6	Грузовой специальный автобетоносмеситель «МАЗ-6303 33» (АВС-7DA) кузов (рама) № Y3M63033380000061, Y3969361L91041040, 2008 года выпуска, рег. знак АК 8646-3, инв. № 844	**33 000,00**	1 650,00	3 300,00

Продавец: ОАО «Гомельоблстрой», г. Гомель, ул. Малайчука,12. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактным тел.:** 8 (029) 185-37-18 – управляющий в деле о банкротстве Колеснев Николай Михайлович; 8 (044) 700-40-60 – по спецтехнике и оборудованию Кучинский Владимир Александрович; 8 (044) 769-19-61, 8 (0232) 53-27-62 – по недвижимости Яроцкая Людмила Николаевна. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо:** 1). Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); 2). Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 16 мая 2019 г. по адресу:** г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 14 июня 2019 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за **5 (пять) дней** до его проведения.

Для участия в аукционе предоставляются: документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной **на 5 (пять) %.** Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается Организатором торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента его подписания и возместить затраты и расходы на организацию и проведение аукциона в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-З (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)», ст.127–129.

Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы» и www.bankrot.gov.by. Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8(029)126-66-62.

Сямейная газета

Выпуск № 8 (123)

ЛЕТА — ГЭТА...

Канец вучэбнага года набліжаецца імкліва, як электрычка ў метро. А вы ўжо ведаеце, чым заняць дзяцей летам?

Калі абмяркоўваем гэта пытанне з калегамі, людзі ранейшага пакалення наогул не разумеюць, у чым праблема: маўляў, адпраўляйце на ўсё лета ў вёску да бабулі, дзеці і адпачнуць, і самастойнасці навучацца. Выдатна, але што рабіць тым, у каго бабулі і на пенсіі працягваюць працаваць, альбо моцна хварэюць і самі патрабуюць догляду, альбо вядуць актыўнае жыццё і не гараць жаданнем «сядзець з унукамі» цэлае лета, альбо наўпрост, як і ў мяне, «бабулі на вёсцы» не існуе ў прыродзе?

У маім дзяцінстве, дарэчы, была тая самая сітуацыя. Найбліжэйшая і адзіная родная бабуля жыла за тысячы кіламетраў ад нас, на чарнаморскім узбярэжжы, і выправіцца да яе ўдавалася далёка не кожнае лета, зводзячы дэбет з крэдытам.

Таму галоўнай тэмай станавіўся летнік — тады яшчэ піянерлагер, якіх у адной толькі Мінскай вобласці было вялікае мноства. Паколькі лагер быў ад завода, дзе працаваў бацька, і дзеці, і супрацоўнікі адзін аднаго добра ведалі, сяброўскія стасункі не толькі хутка завязваліся, але і працягваліся доўгія гады — раз'язджаючыся, мы адзін аднаму так і гаварылі: «Сустрэнемся наступным летам у старшым атрадзе».

Але гэта дрымучая настальгія і справы даўно мінулых дзён, і сёння з добрага дзясятка летнікаў, напрыклад, на Вячы «жывымі» засталіся добра калі адзін-два. У дзясятках астатніх, закінутых, па пустых карпусах гуляе вецер, і ў лепшым выпадку нелегалы-страйкбалісты ладзяць тут свае баявыя гульні, а ў горшым — усё, што радавала дзіцячыя сэрцы, паступова разбураецца і расцягваецца. З нашага «Усходу», напрыклад, на пачатку 2000-х знік у невядомым напрамку... цэлы самалёт, мадэль якога ўпрыгожвала цэнтральную пляцоўку лагера! Ні праз роспыты былых завадчан, ні праз расследаванні колішніх піянераў яго лёс высветліць так і не ўдалося...

Сёння ж «прафсаюзныя» летнікі — рэч нятанная, даволі дэфіцытная і для многіх бацькоў сумнеўная. І рэч нават не ў бытавым камфорце, хоць для некаторых сучасных малых прыбіральня на вуліцы роўная канцу свету. Значна важнейшы калектыў педагогаў, які працуе з дзецьмі, — калі за справу бяруцца добрыя арганізатары і набіраюць прафесійную каманду, усе будуць задаволеныя, захопленыя і ўсе вушы пранюць: «А можна, мы сюды паедзем на наступны год?», а калі ў калектыве самі ўчарашнія дзеці альбо раўнадушныя ці проста няўмелыя дарослыя — летнік ператворыцца ў катаргу для дзіцяці і згрызоты сумлення для бацькоў.

Насамрэч варыянты, канешне, ёсць: палатачныя летнікі, IT-, бізнес-, спартыўныя і іншыя тэматычныя лагеры з насычанай праграмай, выязныя моўныя практыкумы, у тым ліку ў іншыя краіны, для тых, хто з цікавасцю вывучае замежную мову, тры змены школьных летнікаў... Але ўся гэта разнастайнасць упіраецца ў грошы, і, як правіла, немалыя. Таму многія бацькі па-ранейшаму выбіраюць паміж бабулямі і квэстам «лета ў горадзе». І гэта таксама можа быць няблага, калі помніць, што для дзяцей лета — сапраўды асобнае маленькае жыццё, і якія ўспаміны ад яго застануцца, залежыць ад нас.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Надзея МІКУЛІЧ:

«У НАС УСЁ АДБЫЛОСЯ ПА КАХАННІ»

Калі ўпершыню ўбачыла заслужаную артыстку Беларусі Надзею Мікуліч і яе мужа Барыса Белага, успомніла цытату з расказу Людмілы Уліцкай: «Яны, мала сказаць, кахалі адно аднаго — яны адно аднаму падабаліся». Сёлета Надзея і Барыс адзначаць 45-ю гадавіну сумеснага жыцця. Яны — неверагодная пара! За столькі гадоў не страцілі цікавасці адно да аднаго і пяшчоты ў адносінах. Надзея злёгку засмуцілася, што інтэрв'ю пра сямейнае жыццё дае

ЭКС-САЛІСТКА «ВЕРАСОЎ» АФІЦЫЙНА ВЫЙШЛА ЗАМУЖ, АЛЕ СВОЙ АЎТОГРАФ У ЗАГСЕ НЕ ПАКІНУЛА

адна, — Барыс тады ляжаў у бальніцы. Якраз падчас нашай размовы ён патэлефанаваў жонцы. Думаеце, гэта была справаздача пра стан здароўя ці, барані Божа, скаргі на самаадчуванне? Не! Ён сказаў, што засумаваў, хоць Надзя наведвала яго літаральна ўчора. А яшчэ гэтай пары не займаць аптымізму, пачуцця гумару і ўмення сябраваць.

(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)

Круглы стол

ТРАДЫЦЫЙНАЯ СЯМ'Я ЯК КАШТОЎНАСЦЬ

Як зберагчы базавыя асновы

У Мінску прайшоў круглы стол, прысвечаны Міжнароднаму дню сям'і. Тэмай для абмеркавання сталі шляхі ўмацавання сямейных каштоўнасцяў з мэтай паляпшэння дэмаграфічнай сітуацыі ў Беларусі. Арганізатарамі выступілі Мінская духоўная акадэмія, Сінадальная камісія Беларускай праваслаўнай царквы па пытаннях сям'і, абароны мацярынства і дзяцінства, а таксама дабрачыннае грамадскае аб'яднанне «Цэнтр падтрымкі сям'і і мацярынства «Матуля».

— Сёння пытанні захавання сямейных каштоўнасцяў паўстаюць як ніколі востра, — лічыць **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Валянціна КУРСЕВІЧ.** — У большасці развітых краін свету адзначаецца парушэнне базавых сямейных асноў. Павялічваецца колькасць разводаў і сямейных канфліктаў, падае нараджальнасць, стабільна расце колькасць дзяцей, якія выхоўваюцца адным з бацькоў ці ўвогуле застаюцца без апекі блізкіх.

(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)

Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

16 мая 2019 г. Сямейная газета

Сацыяльная кансультацыя

ДАПАМАЖЫЦЕ ВЫЗНАЧЫЦЬ СТАТУС

На пытанні нашых чытачоў адказваюць спецыялісты Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі.

— У мяне трое дзяцей. Старэйшаму сёлета спаўняецца 18 гадоў. Ці застанецца наша сям'я шматдзетнай?

(**Вераніка КАШЛЕЙ**, *г. Баранавічы*)

— Шматдзетнай з'яўляецца сям'я, у якой на ўтрыманні і выхаванні знаходзяцца трое і больш непаўналетніх дзяцей, гэта значыць дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў. Пры дасягненні старэйшым дзіцем васямнаццацігадовага ўзросту сям'я страчвае статус шматдзетнай.

Шматдзетныя сем'і маюць права на розныя віды дзяржаўнай падтрымкі, ім даюцца дадатковыя сацыяльныя гарантыі і льготы ў сферы жыллёва-крэдытнай палітыкі, працоўнага, падатковага, пенсійнага заканадаўства, пры атрыманні дзецьмі адукацыі, па аплаце жыллёва-камунальных паслуг і іншыя.

Але асобныя віды дзяржаўных гарантый даюцца такім сем'ям і пасля дасягнення дзецьмі 18 гадоў:

— захоўваецца права на стандартны падатковы вылік для абодвух працуючых бацькоў на дзяцей, старэйшых за 18 гадоў, на ўвесь перыяд іх навучання;

— для атрымання шматдзетнымі сем'ямі льготных крэдытаў або аднаразовых субсідый на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў у складзе сям'і ўлічваюцца дзеці ва ўзросце да 23 гадоў;

— права на атрыманне пенсіі з прычыны страты карміцеля маюць дзеці да 18 гадоў, а калі вучацца — то да дасягнення 23 гадоў.

* * *

Мы з мужам выхоўваем траіх дзяцей. Але я маці толькі дваім дзецям. Трэцяе дзіця — мужа ад папярэдняга шлюбу — пражывае ў нашай сям'і. Ці маем мы права на пасведчанне шматдзетнай сям'і і льготы, прадугледжаныя для такіх сем'яў?

— Згодна з арт. 59 Кодэкса аб шлюбе і сям'і, сям'я, гэта аб'яднанне асоб, звязаных паміж сабой маральнай і матэрыяльнай агульнасцю і падтрымкай, вядзеннем агульнай гаспадаркі, правамі і абавязкамі, якія вынікаюць са шлюбу, блізкага сваяцтва, усынаўлення. Гэта значыць адной з падстаў узнікнення сям'і, апроч блізкага сваяцтва і ўсынаўлення, з'яўляецца рэгістрацыя шлюбу.

Таму з уступленнем у шлюб дзеці мужа і жонкі ад папярэдніх шлюбаў, якія пражываюць у сям'і, прызнаюцца членамі гэтай сям'і. І такая сям'я будзе разглядацца як шматдзетная сям'я і зможа карыстацца адпаведнымі правамі і льготамі.

Падрыхтавала Святлана БУСЬКО.

ТРАДЫЦЫЙНАЯ СЯМ'Я ЯК КАШТОЎНАСЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Усё часцей сустракаюцца факты гвалту ў сям'і. Гэтыя негатыўныя сацыяльныя з'явы накладваюць свой адбітак на сям'ю і руйнуюць адносіны ў ёй. Адным з прыярытэтаў дзяржаўнай палітыкі нашай краіны ў галіне нараджальнасці і рэпрадуктыўных паводзін павінна стаць пашырэнне магчымасцяў сем'яў для нараджэння і выхавання дзяцей, рэалізацыя прынцыпаў адказнага бацькоўства, захаванне і ўмацаванне каштоўнасцяў сям'і і шлюбу.

Пытанні дэмаграфічнай бяспекі знаходзяцца на пастаянным кантролі ў кіраўніка дзяржавы. Сёння ўжо можна адзначыць пэўныя пазітыўныя зрухі ў дэмаграфічным развіцці. За апошнія 20 гадоў знізілася дзіцячая смяротнасць, адзначаецца павелічэнне чаканай працягласці жыцця.

— Калі збіраюцца неабыякавыя людзі — гэта і ёсць базіс умацавання сямейных каштоўнасцяў. Кожны па абавязку сваёй службы стараецца данесці нашаму насельніцтву пра важнасць сям'і, — кажа **начальнік аддзела медыцынскай дапамогі маці і дзецям Галоўнага ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі, экспертызы, зваротаў грамадзян і юрыдычных асоб Міністэрства аховы здароўя Беларусі Людміла ЛЁГКАЯ.** — Але праблем, якія

немагчыма вырашыць у рамках аказання медыцынскай дапамогі, на сённяшні момант няма. Ёсць аб'ектыўныя прычыны, якія залежаць не толькі ад сістэмы аховы здароўя. Мне здаецца, трэба больш аддаваць увагі дзецям, больш гаварыць аб тых каштоўнасцях, якія былі ў сем'ях нашых дзядоў. Але, на жаль, зносіны паміж дзецьмі і бацькамі нярэдка замяняюць гаджэты.

Сёння мы нікуды не падзенемся ад агульнасусветных тэндэнцый: людзі сталі значна пазней уступаць у шлюб, жанчыны пазней нараджаюць. У будучых бацькоў ва ўзросце з гадамі з'яўляецца «груз» хранічных захворванняў. Гэта прымушае нас хутчэй укараняць новыя тэхналогіі і актыўна іх выкарыстоўваць, каб дапамагчы рэалізаваць рэпрадуктыўныя правы кожнай сям'і. Калі абмяркоўваць праблемныя пытанні — а гэта аборты, дапаможныя рэпрадуктыўныя тэхналогіі, выходжванне глыбока неданошаных дзяцей, выкарыстанне перынатальных тэхналогій, рост дзіцячай інваліднасці, то без глыбокага аналізу гэтых праблем нам не вырашыць. Улічваючы, што я педыятр, хачу падкрэсліць: першае, на што павінны звяртаць увагу бацькі, — гэта здароўе. Сёння ў структуры дзіцячай смяротнасці чвэрць — гібель ад знешніх прычын. Гэта сапраўдная сацыяльная праблема. Гінуць па сутнасці здаровыя дзеці. Вельмі важна аддаваць увагу навучанню бацькоў, урачы павіны казаць ім пра тыя рызыкі і небяспекі, якія падпільноўваюць дзяцей на розных этапах развіцця. Працуе ўжо дзесяць Цэнтраў па навучанні бацькоў стварэнню бяспечных умоў для дзяцей у быце. Сёлета адчыняць дзверы яшчэ чатыры такія Цэнтры ў рэгіёнах краіны.

— Камітэт па ахове здароўя актыўна працуе з рознымі дабрачыннымі і грамадскімі арганізацыямі па пытаннях умацавання інстытута сям'і, прафілактыкі захворванняў у дзяўчынак і жанчын, — адзначае **галоўны акушэр-гінеколаг камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама Ірына ІКАНАСТАСАВА**. Гэтыя мерапрыемствы носяць масавы характар, і мы ўжо можам пахваліцца станоўчымі водгукамі. Ужо ў жніўні гэтага года павінна стартаваць серыя мерапрыемстваў, накіраваных на адукацыю жаночага насельніцтва. Мерапрыемствы будуць праходзіць на базе нашых медыцынскіх установ і ў буйных гандлёвых цэнтрах.

— Што можа зрабіць дзяржава, каб падтрымаць і ўмацаваць сям'ю? — задаецца пытаннем **дырэктар Інстытута кіраўніцкіх кадраў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, кандыдат эканамічных навук, дацэнт Ганна ЯШЧУК.** —

Мы разумеем, што сям'я — гэта каштоўнасць і аснова, што здароўе першаснае. Але ў XXI стагоддзі беларускія сем'і сутыкаюцца з шэрагам праблем. І таму эканамічныя стымулы і падтрымка дзяржавы займаюць не апошняе месца. Маладая сям'я, прымаючы рашэнне аб тым, колькі дзетак нарадзіць, будзе разлічваць свае сілы і ў матэрыяльным плане. Задача дзяржавы — не ўтрыманскае асяроддзе стварыць, а аказаць падтрымку «на старце», калі сям'я найбольш уразлівая, падчас дэкрэтнага водпуску мамы ці таты.

Да 2013 года назіралася вельмі сумная сітуацыя, бо 70 працэнтаў сем'яў на той час былі аднадзетныя. З 2014 года сталі дапамагаць не толькі шматдзетным сем'ям, але і сем'ям з двума дзецьмі. У падтрымцы больш за ўсё маюць патрэбу якраз маладыя сем'і. Магчыма, варта звярнуць увагу на ўскосныя меры іх падтрымкі. Напрыклад, на сямейныя абанементы ў басейн, фітнес-цэнтры, забаўляльныя цэнтры і іншае.

— У Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб адукацыі фарміраванне сістэмы сямейных каштоўнасцяў з'яўляецца адной з найважнейшых задач, а гэтак жа важным складальнікам выхавання, — упэўнена **намеснік дырэктара па метадычнай рабоце Навукова-метадычнай установы «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Беларусі Людміла РАМАНОЎСКАЯ.** — Дзяржаўная праграма «Адукацыя і маладзёжная палітыка» на 2016—2020 гады абавязвае нас распрацоўваць эфектыўныя метады павышэння педагагічнай культуры бацькоў, падтрымліваць дзейнасць бацькоўскіх асацыяцый, а для нас гэта ў першую чаргу папячыцельскія саветы і бацькоўскія камітэты. Вельмі важны дакумент быў прыняты адносна нядаўна: «Канцэптуальныя падыходы да развіцця сістэмы адукацыі да 2020 года і на перспектыву да 2030 года». Гэты дакумент вызначае, што выхаваўчы патэнцыял усёй сістэмы адукацыі мае мэтай сфарміраваць навучэнца як грамадзяніна-патрыёта, прафесіянала-працаўніка і адказнага сем'яніна. Існуе мноства механізмаў па рэалізацыі гэтых установак і мноства відаў дзейнасці, якія выкарыстоўваюцца ўжо сёння. Нельга сказаць, што фарміраванне сямейных каштоўнасцяў адарванае або існуе адасоблена. Яно пранізвае ўвесь адукацыйны працэс, які ўключае як навучанне, так і выхаванне. Вельмі важныя механізмы, якія дазваляюць удасканальваць нашу дзейнасць, існуюць дзякуючы падпісанай праграме супрацоўніцтва паміж Міністэрствам адукацыі і Беларускай праваслаўнай царквой.

Кіраўнік Сінадальнай камісіі Беларускай праваслаўнай царквы па пытаннях сям'і, абароны мацярынства і дзяцінства протаіерэй Павел СЯРДЗЮК паведаміў, што камісія ўзаемадзейнічае з епархіяльнымі падраздзяленнямі, якія курыруюць пытанні абароны сямейных каштоўнасцяў, органамі дзяржаўнай улады, грамадскімі арганізацыямі.

— Мы аказваем духоўную, інфармацыйную, псіхалагічную, прававую падтрымку сем'ям у цяжкіх жыццёвых сітуацыях. Прадстаўнікі Камісіі прымаюць удзел, у тым ліку арганізацыйны, у міжнародных форумах, рэспубліканскіх, рэгіянальных і епархіяльных канферэнцыях і семінарах, прысвечаных актуальным пытанням абароны традыцыйных сямейных каштоўнасцяў. За мінулы год правялі 43 такія мерапрыемствы.

Мы рэгулярна праводзім аналіз змяненняў дзеючага заканадаўства па праблемах, якія ўваходзяць у кампетэнцыю камісіі. Так, напрыклад, прымалі ўдзел у дыскусіі па праекце канцэпцыі Закона Рэспублікі Беларусь «Аб супрацьдзеянні хатняму гвалту». Працуем ва ўстановах адукацыі, тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, нядзельных школах. Ажыццяўляем юрыдычнае і псіхалагічнае кансультаванне сем'яў у крызісных сітуацыях і аказваем матэрыяльную дапамогу. У 2018 годзе бясплатна аказалі прававую дапамогу 80 сем'ям. У цэлым за год супрацоўнікі камісіі апрацоўваюць каля 950 запытаў. Для нас вельмі важна, каб традыцыйная сям'я па-ранейшаму заставалася для людзей сапраўднай каштоўнасцю.

Падрыхтавала Наталля ТАЛІВІНСКАЯ. Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

Школа стасункаў

Галіна Станілевіч: «Мне не ўсё роўна, у якім свеце будуць жыць мае ўнукі»

Пра тое, як важна разумець свае эмоцыі і кіраваць імі

Людзі, якія здольны разумна ацэньваць свае магчымасці, могуць спакойна абмеркаваць далейшыя дзеянні, не пераходзячы на асобы, і валодаюць уменнем вырашаць канфлікты пры сутыкненні інтарэсаў, сустракаюцца не вельмі часта. А вы, напрыклад, можаце спыніцца і не працягваць бясплодную спрэчку, калі ўсе вакол на ўзводзе? Не ўзвальваць на сябе занадта шмат абавязкаў у стане эйфарыі? А ці здольныя прызнацца самім сабе ў непрывабных пачуццях? Усё гэта навыкі эмацыянальнага інтэлекту, які яшчэ могуць называць сацыяльным.

Аб эмацыянальным інтэлекце загаварылі пасля таго, як выявілася, што традыцыйныя тэсты на інтэлект не здольныя прадказаць паспяховасць чалавека ў кар'еры і ў жыцці ў цэлым. Аказалася, што тэсты на ментальны інтэлект не ацэньваюць здольнасць да эфектыўнага ўзаемадзеяння з іншымі людзьмі і да эфектыўнага кіравання сваімі ўласнымі эмоцыямі. Між тым менавіта гэтыя ўменні ўласцівыя ўсім паспяховым людзям — іншымі словамі, усіх іх аб'ядноўвае высокі эмацыянальны інтэлект.

Па не зусім класічным азначэнні С. Дж. Стэйна і Говарда Бука, якое дае Вікіпедыя, эмацыянальны інтэлект, у адрозненне ад звыклага ўсім паняцці інтэлекту, «з'яўляецца здольнасцю правільна інтэрпрэтаваць сітуацыю і аказваць на яе ўплыў, інтуітыўна ўлоўліваць тое, чаго хочуць і ў чым маюць патрэбу іншыя людзі, ведаць іх моцныя і слабыя бакі, не паддавацца стрэсу і быць абаяльным».

Ці можна гэтаму навучыцца? «Можна!» — упэўненая **кіраўнік Школы развіцця эмацыянальнага інтэлекту Галіна СТАНІЛЕВІЧ.**

Гэтая школа працуе ў Мінску ўжо год, яна існуе ў выглядзе гуртко ў дадатковай адукацыі і актыўна супрацоўнічае са сталічнымі агульнаадукацыйнымі школамі. Кіраўнік школы кажа, што цікавасць да яе дзецішча рэзка вырасла ў гэтым годзе, асабліва пасля таго, што здарылася ў Стоўбцах, калі вучань забіў настаўніцу гісторыі і іншага школьніка і параніў яшчэ дваіх падлеткаў.

Галіна Станілевіч расказала нам аб навыках XXI стагоддзя, аб выкарыстанні сваіх эмоцый і аб тым, як важна не станавіцца іх заложнікам.

ГЭТА НЕ ПРА ВЕДЫ, А ПРА НАВЫКІ

— Зураб Кекелідзэ, галоўны псіхіятр Расіі, неяк у інтэрв'ю прывёў статыстыку, якую рэдка агучваюць, — кажа наша суразмоўніца. — Там палохаючыя лічбы. Адхіленні ў развіцці і дэзадаптацыя сёння назіраюцца больш чым у 60 % школьнікаў. Гэта значыць, такім дзецям будзе вельмі складана адаптавацца ў свеце. Ім будзе цяжка рэалізавацца ў прафесіі, зрабіць кар'еру, узаемадзейнічаць з іншымі людзьмі, пабудаваць сям'ю...

На Захадзе на працягу апошніх дзесяцігоддзяў праводзяць даследаванні: што адбываецца ў нашым быццам бы паспяховым свеце, дзе якасць жыцця паляпшаецца, дастатак расце, але разам з гэтым у людзей расце і дэзадаптацыя, і дэпрэсія. Аказалася, што недастаткова развіваць у дзяцей толькі разумовы інтэлект.

Што прынята лічыць навыкамі XXI стагоддзя? Гэта не толькі кампетэнтнасць і прафесіяналізм. Гэта яшчэ і асабістыя якасці — ад іх залежыць, дзе вы будзеце працаваць, куды вас возьмуць. Можна быць вельмі разумным, але не ўмець размаўляць з людзьмі. А сямейнае жыццё? Як можна яго пабудаваць, не ўмеючы слухаць і чуць іншага чалавека, вырашаць канфлікты і г. д.? Таму гэта вельмі важныя кампетэнцыі.

Прычым гэта не веды, а менавіта навыкі. Усе мы ведаем, што не трэба нервавацца па дробязях, але ў каго ёсць такі навык? Навык — гэта калі веданне ты можаш прымяніць на практыцы.

ДРЭННЫХ І НЯПРАВІЛЬНЫХ ЭМОЦЫЙ НЕ БЫВАЕ

— У побыце эмацыянальны інтэлект мы, дарэчы, часцей за ўсё называем рысамі характару. Напрыклад, калі гаворым пра чалавека, што ён ураўнаважаны, спакойны, прыязны, умее адстойваць сваю пазіцыю і пры гэтым паважаць чужую... Пра чалавека, які ўмее сябраваць, здольны пашкадаваць, папрасіць і прапанаваць дапамогу і яшчэ шмат чаго. Часцей за ўсё мы гэта называем якасцямі характару, і гэта ўсё з'яўляецца навыкамі эмацыянальнага інтэлекту.

Калі ў нас ёсць такія якасці, мы лепш разумеем людзей, не маем у адносінах да іх неапраўданых чаканняў, не патрабуем ад сябе і іншых больш, чым у нашых сілах, не становімся заложнікамі эмоцый.

Наогул, мы вучым дзяцей таму, што дрэнных і няправільных эмоцый няма. Яны павінны быць проста адэкватна выкарыстаныя. І мы вучым, якія эмоцыі для чаго падыходзяць. Напрыклад, не варта ісці на перагаворы ў добрым эмацыянальным стане, з павышаным настроем. Тут трэба трошкі злосці. Таму што весці перагаворы без такой эмоцыі, як злосць унутры, — не вельмі прадукцыйна, гэта значыць, што вы, хутчэй за ўсё, здадзіце свае пазіцыі, адступіце. І значна менш верагоднасці, што вы абароніце свае пазіцыі. Гэта ўсё тонкія грані, але вельмі важныя.

РАСПАЗНАВАЦЬ, РАЗУМЕЦЬ, ПЕРАКЛЮЧАЦЦА...

— У нашай праграме мы займаемся развіццём трох навыкаў. Першы — гэта распазнаванне сваіх эмоцый і станаў, калі чалавек можа назваць, што з ім зараз адбываецца. Калі ён у стане аддзяліць трывогу ад раздражнення, стомленасць — ад апатыі. Такі чалавек не прыме лёгкае захапленне за вялікае каханне, а цікавую перспектыву — за галоўную мэту жыцця.

Другі навык — калі чалавек разумее прычынна-выніковыя сувязі: чаму са мной гэта адбываецца? Што такога здарылася, што выклікала гэты мой стан? І да чаго гэта можа прывесці? То-бок эмацыянальны інтэлект — гэта калі я разумею, што са мной адбываецца, а не толькі нешта адчуваю і выказваю гэтыя пачуцці.

Трэці навык — уменне пераключаць свае эмоцыі. Для гэтага трэба ведаць пэўныя тэхнікі. Напрыклад, калі дзіця знаходзіцца ў радасным стане, а ў яго наперадзе кантрольная работа, то гэты яго стан будзе не вельмі адэкватны. Для таго каб паспяхова здаць кантрольную, трэба дадаць крышку смутку. Тады чалавек стане больш уважлівы і сабраны. Але трэба разумець, што гэта не павінен быць смутак, які наваліўся і ўсё сабой апанаваў, а толькі лёгкі яго налёт. Вось як увесці сябе ў гэты стан?

І калі, напрыклад, дзіця ідзе ў школу са страхам, то не варта чакаць ад яго высокіх ацэнак. У стане страху мозг зацікаўлены ў тым, каб затаіцца і выжыць, а не ў тым, каб атрымліваць новую інфармацыю і выдаваць яе па першым патрабаванні.

РАЗМАЎЛЯЦЬ З ЛЮДЗЬМІ — ВЯЛІКАЯ НАВУКА

— Ёсць яшчэ і чацвёрты аспект — ён ужо больш для дарослых — гэта калі я ўмею кіраваць і сваім станам, і чужым таксама. Вельмі мала людзей умеюць кіраваць сабой. І жыццё такое, што нам неабходна ўмець кіраваць і эмоцыямі іншых. Гэта не значыць маніпуляваць імі або падпарадкоўваць іх. Гэта і ўменне супакоіць іншага чалавека, калі той вельмі раззлаваны, баіцца або засмучаны, і ўменне заразіць сваім пазітывам іншых людзей.

Мы лічым самым яркім сваім дасягненнем тое, што нашы дзеці пачынаюць дзяліцца з намі тым, што яны перажываюць. Ім цікава расказаць пра сябе і паслухаць пра іншых, цікава, а як гэта бывае ў дарослых...

Зараз многія бацькі скардзяцца, што на пытанне «як справы?» — дзеці адмоўчваюцца або гавораць «нармальна». І мы ў адказ кажам дарослым: а вы не спрабавалі расказаць пра сябе? Напрыклад, «я так стамілася, мне сумна, у мяне здарылася тое і тое, вось гэта атрымалася, а гэта — не...». Калі пачаць так гаварыць, то і дзіця ўключыцца і сапраўды гэтак жа пачне расказваць пра сябе.

Таму мы вельмі рады, што нашы дзеці разнявольваюцца, што яны заўважаюць свой настрой і стан і вучацца кіраваць імі, што ў іх павышаецца самаацэнка.

Гэта вялікая навука — умець размаўляць з іншымі людзьмі, і вялікая навука — слухаць іншых людзей і ўмець рэагаваць на іх перажыванні.

Наша школа прыватная. Гэта расійская франшыза, дзе мы навучаем дзяцей па гатовай праграме — навукова абгрунтаванай і сертыфікаванай, карані якой ляжаць у Ельскім універсітэце, але яна адаптаваная да нашых рэалій і менталітэту...

* * *

На маё пытанне ў канцы размовы, чаму яна гэтым занялася, Галіна Станілевіч адказала так: «Па-першае, я прадпрымальнік. Па-другое, я трэнер для дарослых, і гэта тая тэма, якой я займаюся. Але ёсць і трэцяя прычына: я бабуля траіх унукаў. Старэйшаму 17 гадоў, малодшай — 7 месяцаў. Калі мы кажам, што людзі не ўмеюць спраўляцца з сабой, сваімі эмоцыямі — гэта пра тое, што такі свет небяспечны. Ён больш агрэсіўны, непрадказальны. А мне не ўсё роўна, у якім свеце будуць жыць мае ўнукі».

Святлана БУСЬКО.

Мамін дзённік

СТАРЭЙШЫ БРАТ

Наш Цёмік цяпер сапраўдны грамадзянін — у яго ёсць пашпарт. Дарэмна хвалявалася, ці ўдасца сфатаграфаваць дзіця: атрымалася з першай спробы. Малы ўпіўся сваімі цёмнымі вачыма ці то ў прыгожую дзяўчыну-фатографа, ці то ў вялікі фотаапарат, якога ён дагэтуль не бачыў, — і першы крок да афіцыйнага дакумента быў зроблены.

Не, на мора мы сёлета яшчэ не збіраемся. Блізкія сваякі пераязджаюць у суседнюю краіну — трэба ж неяк бачыцца! Доўгую разлуку з брацікам Вадзікам Цёмік наўрад ці вытрымае. Шасцігадовы стрыечны брат — яго галоўная любоў (пасля бацькоў, канешне). Кажуць, яны вельмі падобныя. Мая мама, калі ўпершыню ўбачыла ўнука, адразу ж гэта вызначыла. Ну што тут здзіўляцца, іх бацькі, родныя браты, — копіі адзін аднаго (быў час, калі мой муж па братавых правах ездзіў, і каб хоць хто з даішнікаў нешта западозрыў!).

Яшчэ ў радзільні, калі пляменнік з матуляй прыйшлі мяне наведаць, яму не цярпелася ўбачыць чалавечка, якому, дарэчы, сам даў імя (ніяк не маглі з мужам вызначыцца, цяпер не шкадуем, што даверылі такое важнае рашэнне малодшаму члену сям'і). На другі дзень пасля родаў, вядома, гэта было немагчыма. Вадзім толькі моцна здзівіўся: брацік быццам бы з'явіўся на свет, а ў цёткі Веранікі яшчэ жывоцік на месцы.

Іх першая сустрэча адбылася, калі мы пераехалі да маіх бацькоў. Вадзім шкадаваў Арцёмку за яго яшчэ незагоены зялёны пуп («яму ж баліць!»), спрабаваў накарміць паўтарамесячнае дзіця малінамі і з высока паднятай галавой вазіў малога ў калясцы. Ён — старэйшы брат!

Арцёмка, у сваю чаргу, ведае, дзе ў бабулі стаіць фотаздымак Вадзіма. Падпаўзае да трумо, паказвае пальчыкам на партрэт у рамцы і выдае працяглае «ууу». Толькі ўбачыць браціка, як настрой у малога капрызулі раптоўна мяняецца. Адразу прачынаецца, калі пачуе знаёмы голас, шчыкае Вадзіма за скуру, цягае за валасы — гэта ён так паказвае сваю любоў, тлумачым мы пляменніку. А той і цярпіць, нават калі Арцёмка з усяе сілы замахнецца на яго пультам ці машынкай. Вадзімку будзе балюча, але здачы маленькаму шкодніку ніколі не дасць. Пакрыўдзіцца, што той разбурыў домік з канструктара, які ён так доўга будаваў, але ўсё роўна будзе прасіцца ў нас начаваць, каб удосталь нацешыцца малодшым братам. Іншыя пляменнікі, дарэчы, з Цёмікам гуляць не хочуць. Ім, пяцігадовым і сямігадовым, аказваецца, з дзецьмі гуляць нецікава — яны дарослыя.

Нядаўна хадзілі на дзіцячы дзень нараджэння. Інтэрнат, дзе жыве імяніннік, ажно хадуном хадзіў. Вадзім вазіў Цёмку на машынцы, потом пераключыўся на дзяўчынку, на што тая з рэўнасцю заявіла: «Ідзі да свайго любімчыка!»

Нядаўна ў Вадзіма нарадзілася родная сястрычка. Ён даўно прасіў бацькоў купіць дзіцятка па карце «Халва». Нарэшце, яго мара збылася. Ён дапамагае мяняць маленькай памперс, гойдае ложачак і спявае ёй калыханку, з такім жа імпэтам і гонарам возіць сястрычку ў калясцы. І дзякуй богу, па-ранейшаму просіцца ў нас начаваць, каб як мага больш нацешыцца з Арцёмкам.

Вераніка КАНЮТА.

Да доктара — без сарамлівасці і бар'ераў

У клінічным радзільным доме Мінскай вобласці з'явілася гінекалагічнае крэсла, адаптаванае пад патрэбы жанчын з інваліднасцю. Так у Беларусі стартаваў праект па паляпшэнні паслуг па падтрыманні рэпрадуктыўнага здароўя людзей з асаблівасцямі.

Абсталяванне закупляецца ў межах сумеснай ініцыятывы Фонду ААН у галіне народанасельніцтва і сеткі Глабальнага дагавора ААН у Беларусі, офісам якога з'яўляецца мясцовы сацыяльны фонд «Добра».

— Праект дапаможа атрымліваць медыцынскія паслугі не толькі жанчынам з інваліднасцю, але і тым, хто атрымаў траўму ці па стане здароўя не можа скарыстацца звычайным гінекалагічным крэслам, — кажа **дырэктар мясцовага сацыяльнага фонду «Добра», дырэктар сеткі Глабальнага дагавора ААН у Беларусі Аляксандр СКРАБОЎСКІ.** — Гэта першы крок у вялікім праекце і прыклад узаемадзеяння бізнесу, дзяржавы і міжнародных і лакальных некамерцыйных арганізацый.

— Без такога крэсла даводзілася адчуваць вялікія складанасці. Напрыклад, прасіць кагосьці падняць ці зняць з крэсла падчас наведвання ўрача. Па зразумелых прычынах гэта выклікае дыскамфорт, — тлумачыць **Міс свету — 2017 на інваліднай калясцы Аляксандра ЧЫЧЫКАВА.** — Новае абсталяванне дасць магчымасць жанчынам з інваліднасцю без сарамлівасці наведваць доктара. Дасягненне безбар'ернага асяроддзя — важны крок на шляху развіцця любога грамадства.

Сучасныя гінекалагічныя крэслы, якія дазваляюць атрымліваць якасную медыцынскую дапамогу ў тым ліку і людзям з інваліднасцю, з часам будуць установлены і ў іншых клініках — спачатку абласных, а затым і раённых.

У раддом — з «планам родаў»

Для чаго складаецца гэты дакумент?

Сацыяльны праект «Радзіны» запускае новую ініцыятыву для цяжарных — «План родаў» павышае ўпэўненасць у атрыманні станоўчага вопыту ў родах!» На рэсурсе planrodov.radziny.by можна знайсці ўсю неабходную інфармацыю: свае правы ў родах, шаблоны афіцыйных дакументаў у радзільны дом, паэтапныя крокі ўзаемадзеяння з медперсаналам, адказы экспертаў на распаўсюджаныя пытанні, рэальныя гісторыі беларусак.

Паводле рэкамендацый Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, каб атрымаць станоўчы вопыт у родах, падчас паступлення ў радзільны дом цяжарным пажадана мець «план родаў» у абменнай картцы, які загадзя складзены і абмеркаваны з пацыенткай.

«План родаў» — гэта спрошчаная назва афіцыйнай «Заявы аб уліку правоў і інтарэсаў у правядзенні родаў у радзільным доме». Гэты дакумент жанчына складае для найлепшай арганізацыі родаў ва ўстанове аховы здароўя. Ён дазваляе ўзгадніць правы, патрэбы і інтарэсы жанчыны ў заканадаўча абгрунтаванай форме, павысіць узровень адказнасці жанчын, наладзіць камунікацыю з медыцынскімі работнікамі. Такім чынам, «план родаў» — цалкам легітымны дакумент, яго можа напісаць і ўзгадніць любая жанчына, якой прагназуюцца няўскладненыя роды.

Трэба адзначыць, што «план родаў» ужо выкарыстоўваюць беларускія жанчыны і ў нашай краіне, і падчас родаў за мяжой. Карыстальнікі рэсурсу змогуць убачыць рэальныя гісторыі маці, маці-акушэрак, гінеколагаў, адвакатаў, доўлаў і іншых.

Задача гэтай ініцыятывы — расказаць, што існуе эфектыўны спосаб арганізаваць для сябе, малыша і медработнікаў роды ў радзільным доме найбольш прыдатным для кожнай жанчыны спосабам.

Алена КРАВЕЦ.

Друкуецца ў «Алесі»

Алесь СВІРСКІ:

«ПРЫГОЖАЕ ЦЕЛА ПАЛЮБІЦЬ ЛЁГКА, АЛЕ Ж ЯДНАЕ ДУША»

Народны аматарскі ансамбль «Вербіца» быў створаны ў 1979 годзе. У яго рэпертуары — аўтэнтычны фальклор і сучасныя апрацоўкі, абрадавыя і лірычныя песні розных рэгіёнаў Беларусі. Арыентацыя на захаванне іх першароднага гучання і стылю выканання, імкненне зберагчы народныя традыцыі, абрады, танцы і мову беларускага народа — галоўнае творчае крэда калектыву. Акрамя спеўнай групы, у «Вербіцы» ёсць танцоры і музыкі (гармонік, цымбалы, скрыпка, кантрабас).

Мы ведаем, як выглядае сучасная беларуска, а якой яна была ў старажытнасці? Якімі былі стасункі паміж людзьмі, ці шмат мы ў гэтым страцілі? Што можа расказаць пра жанчыну песня і танец? Чым адметная добрая жонка? Пра гэта сёння разважае музыкант Алесь СВІРСКІ, мастацкі кіраўнік беларускага народнага фальклорнага ансамбля «Вербіца» Палаца культуры Мінскага аўтамабільнага завода.

— Найлепшыя якасці ў жанчыны...

— Шчырыя вочы, гарачае сэрца і ўзаемнасць у стасунках.

— Кажуць, што жанчына — гэта загадка...

— Так, і задача мужчыны ўсё жыццё яе разгадваць. Напэўна, гэта магчыма, але, калі ўжо разгадаў, не трэба гэтага паказваць. *(Усміхаецца.)*

— Што ні ў якім разе нельга казаць жанчыне?

— Хлусню. Не трэба падманваць, бо страчваецца давер і павага, а менавіта яны — залог шчаслівых адносін.

— Добрая жонка — якая?

— Тая, што заўсёды цябе чакае, каханне якой ты заўжды адчуваеш, з ёю табе добра і хораша. І яна смачна гатуе. *(Усміхаецца.)* Хоць у наш час я не лічу, што месца жанчыны на кухні. Калі праз нейкія прычыны каханая не можа ці не хоча гатаваць, ці проста стамілася, я сам усё зраблю. Гэта мне не замінае, карона не падае. І калі трэба ў хаце прыбраць, нічога дзіўнага ў гэтым не бачу. А вось адпрасаваць штаны сабе можа толькі мужчына, таму гэтым займаюся выключна асабіста.

— Калі б жанчыны былі музычным інструментам, то якім?

— Самым дасканалым — голасам. Голас можа выказаць сум, радасць, непасрэднасць ці нейкія трывогі. Такі розны, універсальны, ён адлюстроўвае самыя разнастайныя пачуцці. Як і нашы жанчыны.

— Вы працуеце ў калектыве, большую частку якога складаюць жанчыны. Ці ўзнікаюць у сувязі з гэтым якія-небудзь асаблівасці ў рабоце?

— Узнікаюць. Прыемна працаваць. *(Усміхаецца.)* Мая каханая Вольга Ладуцька таксама спявае ў нашым калектыве.

— Гэта натхняе?

— Напэўна, гэта больш яднае нас і ўзмацняе наша каханне. У паездках мы разам. Ёй няма хваляванняў, дзе я і чым заняты, ды і што тут казаць, няма прычын для рэўнасці. Яна — мая падтрымка, бо я кіраўнік, і бываюць моманты, калі мне набходна дапамога блізкага чалавека.

— Як па-вашаму, колькі жыве каханне?

— Пакуль жыве чалавек. Гэта пачуццё нараджаецца, расце, выспявае, дае нейкі плён — і кожны этап па-свойму цудоўны. Спачатку чалавек павінен прайсці стадыю ружовых акуляраў, якая ўзнікае пры знаёмстве, і закахацца ў душу, не кранаючы цела. Гэта вялікая справа, бо прыгожае цела палюбіць лёгка, але яно зменлівае: пакуль мы маладыя, усе прыгожыя. Калі чалавек пакахаў душу, гэта пачуццё можна пранесці праз усё жыццё. Таму так радасна бачыць бабуль і дзядуль, якія прагульваюцца па вуліцах, ходзяць у кавярні і падарожнічаюць разам.

— Але часам каханне знікае ці мы аддаём яго іншаму чалавеку...

— Так, чалавек заўсёды шукае. Добра, калі ён знаходзіць сваю палавінку адразу і ўсё атрымліваецца. А бывае такое, што людзі разам шмат гадоў, і ў нейкі момант разумеюць, што не падыходзяць адно аднаму. Ці некаторыя проста жывуць побач, без кахання, «дзеля дзяцей». Калі дзеці вырастуць, яны не ацэняць гэтага. Каб не жыць з болем штодзень, лепш сказаць «прабач» і адпусціць.

— Як ставіцеся да рэўнасці?

— Шмат чытаў пра гэта і шмат разважаў. Напэўна, у нейкай ступені рэўнасць мае права быць. Бо тады партнёр будзе адчуваць, што за яго нехта хвалюецца, перажывае. А калі чалавек не раўнуе, можна сказаць, што яму ўсё роўна. Ці гэта ўжо такі давер і ўпэўненасць. Але, як спяваў Высоцкі: «Не люблю ўпэўненасці сытай».

— Як жанчыне даведацца, што мужчына сапраўды закаханы ў яе?

— На мой погляд, каханне — гэта перш-наперш клопат пра чалавека. Калі мужчына кахае жанчыну, ён будзе хвалявацца, каб ёй было добра і ўтульна. І не толькі ў кветкава-цукерачны перыяд, а на працягу ўсяго жыцця. Гэта нават глыбей... Каханне — сёння гэта слова, на жаль, мае павярхоўны сэнс. Людзі сустракаюцца і — што тут хаваць — адразу разам жывуць. Пажылі — добра калі год! — «мы не падыходзім адно аднаму». Гэта ўсё так лёгка. Чалавек, быццам матылёк, лётае з кветачкі на кветачку. Пры гэтым страчваецца нейкі глыбокі сэнс жыцця, узнікае звычайны спартыўны інтарэс, прага да нейкага параўнання партнёраў. А сапраўднае каханне — гэта клопат, павага, давер.

— Ці ёсць рысы, па якіх можна вызначыць, што мужчына падыходзіць для сур'ёзных стасункаў?

— Выхаванне мужчыны праяўляецца адразу. Таксама бачна, культурны, прыстойны ён ці не вельмі. Тое, як хлопец ставіцца да сваёй маці, адразу адлюстроўвае, як ён будзе ставіцца да сваёй жонкі. Гэта закладзена з дзяцінства. Калі ён не паважае сваю маці, не трэба думаць, што ён будзе паважаць іншых жанчын. Можа, толькі напачатку, а потым — «ведай сваё месца» ды і ўсё.

— Што такое быць жанчынай?

— Жанчына — гэта сусвет, космас, глыбіня. І безумоўна, такая жанчына, якая сама гэта разумее і правільна сябе падае, заслугоўвае вялікай павагі. З такой цікава. Напэўна, жанчынай быць цяжка, гэта вялікая праца. Сёння многія хочуць быць на ўзроўні з мужчынамі, што мае права быць. Толькі ў іх страчваецца нейкая жаноцкасць і пяшчота...

— Каханне — гэта калі...

— Адзін без аднаго не можа існаваць і дня.

Віталіна БАНДАРОВІЧ.
Фота з архіва Алеся Свірскага.

КАЛІ ХЛОПЕЦ У ТАНЦЫ «ЛАПАЦЬ», БУДЗЕ «ЛАПЦЕМ» ПА ЖЫЦЦІ

— У інтэрв'ю вы не раз казалі, што ў кожнай песні ёсць гістарычны код. Таму цікава даведацца: якімі паўстаюць беларускія жанчыны ў нашых песнях?

— Ведаеце, амаль усе нашы песні пра каханне. І ёсць шмат пра цяжкую жаночую долю. Але лёгкай быць не магло: трэба было працаваць, гадаваць дзяцей ды гнуць спіну ў полі. Не сказаць, што ў мужчын доля была лягчэйшая: яны таксама шмат працавалі і часта ваявалі. Колькі ёсць рэкруцкіх і салдацкіх песень! Але людзі знаходзілі час на вячоркі і сустрэчы, танцы і спеўкі. Дарэчы, танцы былі вельмі цікавыя, яны выхоўвалі маладых. Напрыклад, першы танец на вячорках яшчэ з часоў ВКЛ дазваляў юнаку дакранацца толькі да локця дзяўчыны. Танец гэты вельмі просты. Людзі становяцца ў кола, за рукі не бяруцца. Спачатку ідуць плаўныя рухі і падскокі. А потым яны па кругу бяруць адно аднаго за локаць. Хлопцы — левую руку за спіну, а правай рукой кранаюць локаць дзяўчыны. Гэта танец, калі ўсе прыглядаюцца адно да аднаго. Бо людзі збіраліся з некалькіх вёсак, навошта ж яшчэ былі гэтыя танцы? Гэта сустрэча не толькі, каб бавіць час, але і каб хлопец абіраў сабе дзяўчыну. Другі танец, напрыклад, «Млын», быў такі: выбіралі сабе пару, але яшчэ не ведалі адно аднаго. Станавіліся ў кола, чаргуючыся: хлопец-дзяўчына, хлопец-дзяўчына. Правыя рукі ў цэнтр кола, і ішлі па крузе, тры воплескі ў далоні — і ў іншы бок. А пасля ўжо ішла полечка, тады хлопец мог узяць дзяўчыну за талію, патанцаваць, і пры гэтым падчас танца маглі трошкі паразмаўляць. Потым зноў станавіліся ў кола, ішлі ў адзін бок, у другі — зноў полька. Але кожны раз моладзь мяняла партнёраў — так яны знаёміліся. Далей танец — падэспань. Асаблівасць яго ў тым, што дзяўчына стаіць спінай і трымае руку ўверсе, далонню да неба. Тут можна паглядзець, які ў яе стан, наколькі прыгожая постаць і як яна панясе каромыслы з вёдрамі. *(Смяецца.)* Гэта і гумар, і ўсур'ёз, бо праз танцы маладыя людзі прыглядаліся. Дарэчы, тады такога не было, што людзі пажаніліся, пажылі нейкі час і разыходзіліся. Яны сур'ёзна ставіліся да таго, каго сабе выбіраюць. Як дзяўчына спявае, як танчыць, як смяецца... такая яна будзе і ў жыцці. Тое ж датычыцца і хлопцаў. Калі ён у танцы «лапаць», то і будзе «лапцем» па жыцці. Дзяўчаты ж таксама выбіралі жаніхоў. Для мужчын былі сілавыя танцы, якія праводзіліся, пакуль дзяўчаты адпачывалі. Напрыклад, танец-гульня «Патэльня». З мужчынскіх паясоў на зямлі выкладвалася кола. Хлопцы браліся за рукі, і, калі вядучы скажа «гарачая патэльня», кожны павінен паспрабаваць адзін аднаго запіхнуць у кола, а сам застацца па-за яго межамі. Тыя, хто трапіў у кола, выбываюць. Вядучы блытае: «Гарачы... пацалунак»,— хлопцы ідуць па крузе і нічога не робяць. «Гарачае... надвор'е», — таксама. Калі ён скажа «гарачая патэльня», мужчыны аказваліся ў коле, і так аж пакуль не застанецца адзін, самы моцны і самы спрытны. Ці гульня «Яшчур», якая праводзілася на Купалле. Бралася такая доўгая жэрдка, якая пабывала ў купальскім вогнішчы, і вось ёй хлопец круціў па крузе, што было, дарэчы, небяспечна. А астатнія павінны былі пераскокваць, бо, калі не пераскочыш, атрымаеш гарачай галавешкай па нагах. Такім чынам выяўляўся спрыт. Многае ў тыя часы было разумным і правільным. Мы, на жаль, адышлі ад гэтага. Іншыя культуры нішчаць наш код, што закладзены ў крыві продкамі. Шкада — мы свайго не беражом і нават, на жаль, цураемся.

Надзея МІКУЛІЧ і Барыс БЕЛЫ.

«У НАС УСЁ АДБЫЛОСЯ ПА КАХАННІ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

— Раскажыце, як пачынаўся ваш службовы раман?

— Падчас рэпетыцыі ў залу прыйшоў наш гукарэжысёр з хлопцам — такім прыгажуном у белым плашчы. Люда Ісупава кажа: «Гэты — мой». А я ў адказ: «Ну, гэта мы яшчэ пабачым!» Як высветлілася, Барыс прыйшоў уладкоўвацца ў «Верасы» рабочым сцэны. Многія з нас, у тым ліку і я, жылі тады ў філарманічным інтэрнаце на Кахоўскай (Ён і цяпер там знаходзіцца. — **Аўт.**). Ядзя Паплаўская жыла з бацькамі ў тым жа раёне. Таму пасля рэпетыцый мы ўсім калектывам часта хадзілі ў кіно, і я ўжо старалася сесці побач з Барысам. Адпаведна, ён мяне і праводзіў.

Мы нейкі час прыглядаліся адно да аднаго (дарэчы, гастролі спрыяюць раскрыццю характару чалавека). Неўзабаве пачалі сустракацца як пара.

«На лецішчы ў нас дэвіз: добрыя адносіны ў сям'і даражэйшыя за чыста выпалатыя градкі».

Але Барыс — хлопец амбіцыйны, ён вырашыў прайсці стажыроўку, каб стаць адміністратарам. Спачатку вучыўся, а потым працаваў у «Чараўніцах». Мы доўга не бачыліся, таму што графікі гастроляў не супадалі. А неўзабаве Барыс перайшоў у «Верасы» адміністратарам. І два гады мы практычна кожную хвіліну былі разам.

— І вы, і Ядвіга Паплаўская расказвалі, што пасля гастроляў вас «выхоўвала» кіраўніцтва філармоніі за ледзьве не амаральныя па тых часах паводзіны...

— Так, у савецкіх гасцініцах нельга было мужчыну і жанчыне сяліцца ў адным нумары, калі ў іх пашпартах адсутнічаў штамп аб шлюбе. Мы знайшлі выйсце: рэгістраваліся, як належыць, па-асобку, але жылі па парах. Аднак жа знаходзіліся добрыя людзі, якія «сігналізавалі». Дзіўна, што чыталі натацыі толькі мне і Ядзі, хоць пар у ансамблі было больш. Саша з Барысам заўсёды чакалі нас пасля маральнай экзекуцыі.

— Надзея, цікава ваша меркаванне: наколькі ў той час, у пачатку 1970-х, было распаўсюджана сумеснае жыццё без штампа ў пашпарце? І ці не шкадуеце вы аб сваім такім вопыце?

— Магчыма, такіх пар было не так шмат, як цяпер, але ўсё ж людзі спрабавалі спачатку пажыць разам, потым ісці ў загс. Іншая справа, што ўсё гэта старанна хавалася, ды і сацсетак тады не было, каб паведамляць усяму свету пра свой статус. А мы аб нашым вопыце не шкадуем. У нас усё здарылася па каханні, а не таму, што «прыйшоў час», «сяброўкі ўжо паспрабавалі» ці, як кажуць, «са спартыўнай цікавасці».

